

ХТО ШЧАСЛІВЫ ШТОДЗЕНЬ ЗАЙМАЦЦА ФАТАГРАФІЯЙ? ЧЫРВОНКА

ІХ НАЗВАЛІ АТЛАНТАМІ ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 131 (29245)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму (на адкрыцці фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Навагрудку):**

*«Штогод мы адкрываем некалькі такіх спартыўных збудаванняў. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці ў пачатку гэтага года аналагічны комплекс пачаў працаваць у Астраўцы. Пастаўлена задача, каб у кожным раённым цэнтры былі падобныя аб'екты. У кожнай з абласцей у наступныя пяць гадоў запланавана будаўніцтва як мінімум 2-3 такіх ці падобных спартыўных комплексаў».*

# Першы хрусткі ўраджай



Фота БелТА.

На прадпрыемстве «Фірма «Кадзіна» Магілёўскага раёна пачалі ўбіраць раннюю капусту. За тыдзень гаспадарка прадала праз фірмовыя крамы сем тон сакавітай зялёнай прадукцыі. Капусту тут вырошчваюць на 30 гектарах, і, гледзячы на першы ранні ўраджай, аграном-агароднінавод Вікторыя КРУТАВА спадзяецца, што і больш позні сарты не падвядуць.

## КОРАТКА

• **Беларусь накіравала гуманітарную дапамогу ва Украіну для ліквідацыі наступстваў паводкі на захадзе краіны.**



• Урад вызначыў парадак кампенсацыі грамадзянам расходаў на электразабеспячэнне.

• **Па новай праграме «Сямейны капітал» ужо 3662 шматдзетныя сем'і адкрылі дэпазітныя рахункі.**

• Больш за 80 чалавек дзесяці нацыянальнасцяў прыляцелі з Дэлі ў Мінск чартарам «Белавія».

• **Вучоныя БДУ распрацавалі інавацыйную ахоўную маску.**



• Спектакль Купалаўскага тэатра «Шляхціц Завальня» пакажуць у новым аўтакінатэатры ў Мінску.


ISSN 1990 - 763X


Спадчына

## «Перамаглі, адбудавалі нашу краіну і крочым далей у будучыню...»

### Што сімвалізуе ўнікальны габелен з выявай Маці-Беларусі, і хто ўвасоблены ў вобразе франтавой медсястры

**У Гродне падчас святкавання Дня Незалежнасці прадстаўлены габелен, які выткалі спецыяльна да 75-годдзя Вялікай Перамогі. Работа вялася на працягу пяці месяцаў, і ў выніку атрымалася даволі вялікае палатно памерам 1,5 на 2 метры. Ажыццявіла гэты праект творчая група ў складзе мастака Яўгена ШУНЕЙКІ і ткачых Алены ШУНЕЙКІ і Юліі БАРАДЗІНОЙ.**

Першае, што кідаецца ў вочы, — гэта яркія фарбы. Яны асабліва зіхацяць па контуры палатна. Гэта элементы беларускага арнамента, птушкі, васількі, папараць. Вядома, прыцягвае ўвагу цэнтральны вобраз — Маці-Беларусі. Яна трымае на руках маленькага хлопчыка, які гатовы выпусціць у палёт птушку. Паступова позірк пераходзіць на іншыя фрагменты, якіх нямала. Кампазіцыйна габелен падзелены на тры часткі. Першая складзена з двух фрагментаў, на адным з якіх — воіны-вызваліцелі, на другім — партызаны. Гэта тыя, хто здабываў перамогу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Другая частка сімвалізуе сучаснае жыццё, тут прысутнічаюць прадстаўнікі самых розных прафесій. На трэцяй можна знайсці адметныя аб'екты ўсіх абласных цэнтраў і горада Мінска.

— Яркія фарбы — гэта задумка, — расказвае ткачыха Алена Шунейка. — Праўда, на кардоне яны былі не такія яркія, але мы так падабралі ніткі, каб было прыгожа. Каб адчувалася радасць, што мы вытрымалі, перамаглі, адбудавалі нашу краіну і пойдзем далей у будучыню.


СТАР. 4


Запрашальнік

## СЯБРЫ ЗБІРАЮЦЦА НА БЕРАЗЕ ДНЯПРА

**Майстры і творчыя суполкі народных рамёстваў з чатырох краін возьмуць удзел у рэспубліканскім фестывалі «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), які пройдзе ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна 11—12 ліпеня. Дарэчы, упершыню свята адбудзецца пад патранатам ЮНЕСКА.**



Фота БелТА.

Як адзначаюць у Магілёўскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці, на традыцыйным «Александрыйскім кірмашы» чакаюць сёлета народных майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, захавальнікаў традыцыйных рамёстваў не толькі з усіх рэгіёнаў Беларусі, але таксама з Расіі, Украіны і Літвы.


СТАР. 13

Парламенцкі дзённік

# Саюз — гэта не аб прагматыцы

## Забеспячэнне роўнасці правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання — галоўны прыярытэт у рабоце абноўленага парламента Саюзнай дзяржавы

**Пра гэта расказаў падчас сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА. Ён упэўнены, што парламентарыям неабходна падвоіць намаганні па зняцці штучных бар'ераў, перадоленні негатыўных трэндаў у гандлі, нафтагазавай сферы.**

«Важнасць гэтай задачы ва ўмовах пандэміі і сусветнага крызісу, які нарастае, робіцца відавочная. Нашы грамадзяне і эканомікі маюць патрэбу ў тым, каб жыццё вярнулася ў нармальную плынь. Неабходна як мага хутчэй з захаваннем усіх супрацьэпідэмічных мер выходзіць на паўнавартаснае аднаўленне аўтамабільных, авіяцыйных і чыгуначных зносін, зняцце ўсіх абмежаванняў руху грамадзян праз беларуска-расійскую граніцу», — прапанаваў Уладзімір Андрэйчанка.

Чарговая, 58-я сесія Парламенцкага сходу адбылася ў рэжыме відэаканферэнцыі. Падчас яе прысутныя зацвердзілі кандыдатуры новых прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў гэты орган Саюзнай дзяржавы. Уладзімір Андрэйчанка быў абраны на пасаду першага намесніка старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Саюзную дзяржаву спікер ніжняй палаты беларускага парламента назваў унікальным геапалітычным праектам, ад паслядоўнай рэалізацыі якога залежаць рэгіянальная бяспека і будучыня нашых краін. Асаблівая роля ў ім належыць парламентарыям, якія, як ніхто іншы, усведамляюць: паспяховы саюз немагчыма пабудаваць толькі на прагматызме.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што інтэграцыя прадугледжвае раўнапраўе бакоў: «Нягледзячы на розніцу ў маштабах нашых краін, менавіта раўнапраўныя саюзніцкія адносіны ў аднолькавай ступені выгадныя для Беларусі і Расіі, бо служаць рэальнаму ўзмацненню аўтарытэту, нарошчванню эканамічных патэнцыялаў і захаванню нацыянальнай культурнай ідэнтычнасці нашых народаў. Інтэграцыя — не самамэта, а інструмент, які дапамагае нам забяспечваць дабрабыт насельніцтва, высокую якасць жыцця». Менавіта з гэтых пазіцый будуць выходзіць парламентарыі, фарміруючы парадак работы на перспектыву.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што ў дэпутатаў назапасіліся нявыкарыстаныя рэзервы ва ўсіх сферах супрацоўніцтва. Самае галоўнае ў дзейнасці Саюза, па яго словах, — што грамадзяне Беларусі і Расіі павінны рэальна адчуваць эканамічныя і сацыяльныя выгады інтэграцыі ў выглядзе росту дабрабыту, умацаванні міру і стабільнасці.

На сесіі разгледзелі таксама выкананне Плана мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы на 2019 — 2020 гады, прысвечаных 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. На парадку дня пасяджэння таксама былі і бюджэтныя пытанні.

### Парламенцкая асамблея АБСЕ не накіруе назіральнікаў на прэзідэнцкія выбары ў Беларусь

Пра гэта журналістам заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ.** Гэта звязана з эпідэміялагічнай сітуацыяй.

«Я ўжо абмяркоўваў гэта з Парламенцкай асамблеяй АБСЕ. Безумоўна, мы зацікаўлены ў запрашэнні нашых калег. Але Парламенцкая асамблея АБСЕ ўжо паведаміла, што не зможа накіраваць сваіх назіральнікаў», — праінфармаваў ён.

Пытанне пра тое, якія замежныя калегі прыедуць у час выбараў у Беларусь, па словах дэпутата, цяпер вырашаецца. Ёсць спадзяванні ўбачыць у жніўні на электаральнай кампаніі ў якасці назіральнікаў прадстаўнікоў структур Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Блізкая ўлада

# ВЫТВОРЧАСЦЬ, ДАРОГІ І ЖЫЛЛЁ

## З такімі пытаннямі ішлі на прыём да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ў Шаркаўшчыне

**Першыя на прыём да Ігара СЕРГЕЕНКІ звярнуліся два інвестары. У Шаркаўшчыне яны хочуць адкрыць домабудаўнічы камбінат. Ужо набытыя пляцоўка і будынак пад вытворчасць каркасных дамоў. Праект амаль гатовы. На заводзе плануюць працаўладкаваць 50-60 чалавек. У інвестараў гатовы бізнес-план, створаны праекты дамоў, прапрацаваны рынкі за мяжой. Бізнесмены просяць дапамогі ў дадатковым фінансаванні і выдзяленні сродкаў з інвестфонду аблвыканкама. Але праблема ў тым, што з гэтай крыніцы грошы можна атрымаць на куплю абсталявання, а яны патрэбныя на будаўніча-мантажныя работы. Усе запазычанні пасля запуску вытворчасці інвестары абяцаюць паступова вярнуць. Ігар Сергеенка адзначыў, што пытанне разгледзяць з прыцягненнем спецыялістаў і дадуць адказ. «Тэма важная. Ствараюцца рабочыя месцы, таму ў рамках закона дапаможам вам», — сказаў ён.**



Фота БелТА.

Жыхарка аграгарадка Лужкі звярнулася з асабістым пытаннем. Жанчына раней атрымлівала крэдыт на рэканструкцыю дома, цяпер ёй зноў патрэбныя грошы на гэтыя ж мэты. Але па законе двойчы выдаваць падобны крэдыт нельга. «Разбяромся з вашай справай. Для гэтага і існуюць прыёмы, каб у такой нестандартнай сітуацыі знаходзіць рашэнні», — заўважыў Ігар Сергеенка.

Звярталіся людзі і з просьбай адрамантаваць дарогі. Жыхар вёскі Сталіца ад імя вяскоўцаў прасіў заасфальтаваць гравійную дарогу Германавічы — Прамяны даўжынёй 2,5 кіламетра. Узнімалася пытанне рамонту дарогі да могілак у аграгарадку Вялікае Сяло. Гэта палявая дарога, у непагадзь па ёй ні прайсці ні праехаць. У найбліжэйшы час яе прывядуць у парадак. У першым выпадку работы спатрэбяцца больш маштабныя, таму налета маюць намер прыступіць да распрацоўкі неабходнай дакументацыі.

На прыём да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта звярнулася больш за дзесяць чалавек. Прасілі ў тым ліку дапамагчы вярнуць пазычаныя нядобрасумленнаму знаёмаму грошы і прыцягнуць яго да адказнасці, вырашыць зямельную спрэчку. Закраналіся пытанні павелічэння магутнасці мясцовых электрасетак для ацяплення і гарачага водазабеспячэння з дапамогай электрычнасці ў прыватных дамах, выдання кнігі. Усе пытанні ўзятыя на кантроль.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Ігар Сергеенка адзначыў, што Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае праводзіць прыёмы грамадзян. Сёлета яе прадстаўнікі маюць намер наведаць усе раёны Беларусі. «Прыём у Шаркаўшчыне паказаў, што райвыканкам прымае меры па вырашэнні надзённых жыццёвых праблем жыхароў. Сёння прыём атрымаўся разнапланавы, агучваліся тэмы развіцця бізнесу, асфальтавання вуліц, выдзялення крэдытаў для рамонту жылля, энергазабеспячэння. Частка пытанняў вырашалася на месцы, іншыя будуць яшчэ вывучацца», — расказаў Ігар Сергеенка.

Ён нагадаў, што нядаўна кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне аб дадатковых мерах па вырашэнні актуальных пытанняў жыццядзейнасці насельніцтва. Прыём у Шаркаўшчыне паказаў своечасовасць такога дакумента, таму што ў зваротах людзей гучалі прапісаныя ў ім тэмы.

**Паводле БелТА.**

Ва ўрадзе

# Знізіць імпарт і зменшыць колькасць хвароб

## Віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА азнаёміўся з развіццём кардыялагічнай службы краіны

**«У нас пабудаваная сістэма, якая забяспечвае аказанне насельніцтву кардыялагічнай дапамогі па сусветных стандартах», — заявіў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка па выніках наведвання РНПЦ «Кардыялогія».**



Фота БелТА.

Віцэ-прэм'ер агледзеў дыягнастычны і лячэбны корпусы, аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі, функцыянальнай дыягностыкі, ангіграфічныя аперацыйныя і паназіраў за будаўніцтвам корпуса гібрыднай сардэчна-сасудзістай хірургіі.

Стварэнне цэнтра гібрыднай кардыяхірургіі ўключанае ў Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. Будаўніцтва новага корпуса пачался вясной гэтага года, завяршэнне запланавана на 2024 гады.

«Усё змяняецца ў гэтым свеце, як, зрэшты, і падыходы ў кардыяхірургіі, — расказаў журналістам **дырэктар РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандр МРОЧАК.** — Калі раней гэта былі адкрытыя аперацыі, то сёння тэхналогіі даюць магчымасць праз малы разрэз або нават пункцыю правесці ў сэрца клапан. Размова пра тое, каб магчымасці ажыццяўлення такога роду аперацый былі ў галоўнага сардэчнага цэнтра краіны. Для гэтага неабходны адпаведныя архітэктурныя рашэнні і абсталяванне, што ўвасабляецца ў новым будынку, — гэта перспектыва на многія гады».

Прынцыповае адрозненне гібрыдных аперацыйных — наяўнасць абсталявання для візуалізацыі. Для кардыяхірургаў гэта сучасныя ангіёграфы, больш бяспечныя, чым апараты папярэдняга пакалення. Новыя прыборы валодаюць яшчэ і функцыяй камп'ютарнай тамаграфіі. Гэта дазваляе хірургу дакладна планаваць ход аперацыі і з улікам нюансаў, якія ўзнікаюць на хірургічным стале, змяняць сваю тактыку.

Па словах Аляксандра Мрочака, гібрыдныя аперацыі могуць праходзіць нават калі пацыент у прытомнасці, пад мясцовай анестэзіяй, што змяншае рызыку лятальных вынікаў, забяспечвае больш паспяховую рэабілітацыю і больш хуткае вяртанне да нармальнага жыцця і работы.

Цяпер у Беларусі можна атрымаць практычна любую кардыялагічную дапамогу, больш за тое — не толькі ў Мінску, але і абласных цэнтрах. «Практычна ўся сардэчная паталогія канцэнтруецца ў нас, — расказаў Аляксандр Мрочак. — Ёсць некаторыя кірункі, вельмі вузкія, дзе мы не маем дастатковага вопыту, бо такіх пацыентаў у нас няшмат. Тады даём згоду, каб такога пацыента лячылі за мяжой. Але, па-мойму, за апошнія пяць гадоў ніхто за мяжу лячыцца не з'язджаў».

Раней вялікая колькасць хворых на арытмію беларусаў вымушана была ехаць па лячэнне ў Літву, сёння айчынныя ўрачы ўсе аперацыі па наладжванні рытму робяць самастойна і нават у нечым перагналі літоўскіх калег, кажа дырэктар цэнтра.

РНПЦ «Кардыялогія» робіць 3378 аперацый у год, і гэта менш за палову ад агульнай колькасці аперацый на сэрцы па краіне. Першая нацыянальная праграма па дэмаграфічнай бяспецы прадугледжвала адкрыццё аддзяленняў кардыяхірургіі ў абласных цэнтрах. Цяпер яны дасягнулі такога ўзроўню, што робяць большую частку хірургічнага лячэння. РНПЦ бярэ самыя складаныя выпадкі, а калі хворы нетранспартабельны, брыгада сталічных урачоў выязджае ў рэгіён.

З 2009 года ў Беларусі праводзяцца аперацыі па трансплантацыі сэрца. З таго часу і да пачатку гэтага года выканана 367 такіх аперацый, у тым ліку 76 — замежным пацыентам. Трансплантацыя — галоўны артыкул экспарту паслуг РНПЦ «Кардыялогія». Сюды прыязджалі па дапамогу з 21 краіны Еўропы, Канады, ЗША, Венесуэлы, Кубы, Ізраіля, краін постсавецкай прасторы. А Украіна падпісала дамову на ўзроўні Міністэрства аховы здароўя і нават авансуе аплату наперад.

«Па выніках мінулага года экспарт паслуг РНПЦ «Кардыялогія» склаў больш за 1,8 мільёна долараў», — паведаміў Ігар Петрышэнка журналістам і выказаў надзею, што з уводам новых аперацыйных ужо ў жніўні гэтага года, а пазней і новага корпуса, вырасце аб'ём аказання дапамогі і беларусам, і замежным пацыентам.

На сустрэчы з віцэ-прэм'ерам кардыёлагі закранулі і праблемныя пытанні, з якімі сутыкаюцца, — такія, у прыватнасці, як тэхналагічная бяспека. «Вельмі вялікая колькасць расходных матэрыялаў забяспечвае гібрыдную хірургію і вялікія кардыялагічныя аперацыі, — расказаў прадстаўніку ўрада дырэктар РНПЦ. — На жаль, амаль усё гэта імпартнае. Пытанне ўжо ўзнімалася, але пакуль беспаспяхова». Ёсць два прадпрыемствы, якія сёння рэальна аказваюць дапамогу кардыяхірургам, але гэтага недастаткова.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ўсе праблемныя пытанні будуць узятыя кіраўніцтвам краіны пад увагу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Прыемная навіна

# Беларусбанк зніжае стаўкі па крэдытах

**Літаральна днямі найбуйнейшы банк краіны зрабіў крокі, якія рэальна дапамагаюць людзям і бізнесу выжываць у гэты цяжкі час.**

## З падтрымкай шматдзетным сем'ям

Банк, выступаючы правадніком Дзяржаўнай праграмы будаўніцтва жылля для грамадзян, разумеючы яе сацыяльную значнасць, у першую чаргу актыўна падтрымлівае шматдзетныя сем'і, аказвае ім крэдытную падтрымку ў рамках указаў кіраўніка дзяржавы. Сёлета Прэзідэнтам перад удзельнікамі дзяржпраграмы будаўніцтва жылля пастаўлена задача: прыняць усе неабходныя меры па забеспячэнні шматдзетных сем'яў уласным жыллём на працягу года з моманту іх пастаноўкі на ўлік тых, хто мае патрэбу.

Беларусбанк, са свайго боку, з мэтай выканання даручэння з пачатку гэтага года ўжо накіраваў 375 мільёнаў рублёў на крэдытаванне ў рамках Указа № 240 і больш за 45 мільёнаў рублёў у адпаведнасці з Указам № 13.

— Банк, удзельнічаючы ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы, робіць усё магчымае для таго, каб шматдзетныя сем'і змаглі скарыстацца ў поўнай меры сваім правам на ўласнае жыллё, — кажа **намеснік старшыні праўлення Святлана КАЖЭКІНА.** — Калі дадаткова да дзяржаўнай падтрымкі на набыццё нерухомасці патрабуюцца ўласныя сродкі, то банк гатовы выдаць шматдзетнай сям'і крэдыт на куплю жылля. Акрамя таго, з 7 ліпеня для шматдзетных сем'яў, якія паляпшаюць жыллёвыя ўмовы з дзяржаўнай падтрымкай, пры неабходнасці дакрэдытавання на ўмовах, вызначаных банкам, даходы паручыцеляў могуць уключацца ў сукупны даход крэдытаатрымальніка.

Дадаткова варта нагадаць, што банк з 1 ліпеня 2020 года знізіў працэнтную стаўку па новазаключаных крэдытных дагаворах на фінансаванне нерухомасці на ўмовах, вызначаных банкам. Працэнтная стаўка па такіх крэдытах цяпер складае 13,51 %.

## Дапамога бізнесу і не толькі

Як вядома, фінансавы інстытут з мэтай падтрымкі бізнес-ініцыятыў і занятасці прадпрымальнікаў аказвае крэдытную падтрымку сектару малога і сярэдняга бізнесу (МСБ). Для гэтага сегмента ў банку дзейнічае спецыяльная праграма фінансавай падтрымкі з самымі нізкімі стаўкамі ў цэлым па банкаўскай сістэме. У рамках праграмы падтрымкі МСБ прафінансавана больш за 6500 праектаў.

Падтрымліваючы прыватны сектар у цяперашняй няпростай сітуацыі, для суб'ектаў МСБ банк знізіў на 2 % стаўку па крэдытным прадукце «Мікра-бізнес абарот». Сёння стаўка па крэдыце ў беларускіх рублях на мэты бягучай дзейнасці (за выключэннем выплаты зарплаты), рэфінансаванне запазычанасці для суб'ектаў бізнесу, якія зарэгістраваны альбо ажыццяўляюць дзейнасць у гарадах-спадарожніках, складае 4,75 % гадавых. Для астатніх прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу па краіне ў рамках прадукту «Мікра-бізнес абарот» працэнтная стаўка — ад 6,75 % гадавых. Гэтыя ўмовы будуць дзейнічаць да 15 верасня 2020 года ўключна.

Не забывае банк аб праблемах сваіх кліентаў, якія ў свой час адкрылі крэдытную лінію на нерухомасць у замежнай валюце. У мэтах змяншэння фінансавай нагрузкі і падтрымкі грамадзян з першых дзён ліпеня Беларусбанк зніжае працэнтную стаўку па раней выдадзеных крэдытах на фінансаванне нерухомасці ў замежнай валюце да 5 працэнтаў гадавых.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Меркаванне

# Мы бяром усё новыя вышыні



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання па міжнародных справах Сяргей СЫРАНКОЎ упэўнены: каб захаваць і прымножыць спадчыну, абавязковая кансалідацыя грамадства.**

— Па мерках гісторыі 25 гадоў, чвэрць стагоддзя — гэта імгненне. Але нягледзячы на гэта, наш народ, які стагоддзямі імкнуўся да стварэння ўласнай дзяржавы, упэўнена прадэманстраваў усяму свету, што дзякуючы мірнай стваральнай працы і ў такі кароткі перыяд часу можна стварыць сучасную краіну, якая дынамічна развіваецца, — астравок міру, стабільнасці і бяспекі.

Атрымаўшы ў спадчыну крохкія асколкі вялікай дзяржавы, мы здолелі захаваць і мадэрнізаваць нашу прамысловасць, дыверсіфікаваць эканоміку, стварыць баяздольную армію, перамагчы арганізаваную злачыннасць. А імкнучыся да павышэння якасці жыцця людзей — значна палепшыць сацыяльную інфраструктуру, стаць адным з лідараў у IT-сферы і, самае галоўнае, выхаваць новае пакаленне беларусаў, якія шчыра любяць сваю айчыну.

Мы бяром усё новыя вышыні, гістарычныя рубяжы і ўпэўнена глядзім у будучыню. І сёння як ніколі важна кансалідаваць грамадства, каб захаваць і прымножыць дасягнутае.

**Запісала Варвара МАРОЗАВА.**

Спажывец

# Рэбрэндынг у «райпо»

**Да канца года Белкаапсаюз плануе адкрыць інтэрнэт-крамы ва ўсіх раёнах краіны. Пра гэта расказала начальнік упраўлення гандлю арганізацыі Вольга КУНЦОВА.**

— Першая крама падобнага фармату з'явілася ў лютым у Верхнядзвінску. На сённяшні дзень іх працуе ўжо 17 у розных рэгіёнах краіны, дзе прадстаўлены ўвесь асартымент. Усяго ў сістэме Белкаапсаюза каля 6,6 тысячы гандлёвых аб'ектаў, у тым ліку прыблізна 600 перасоўных аўтамакрам. Яны абслугоўваюць не толькі буйныя райцэнтры, але і самыя маленькія населеныя пункты на некалькі жыхароў. На ўсіх аб'ектах працуе каля 40 тысяч прадаўцоў.

**Старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый ІВАНОЎ** адзначыў, што арганізацыя спажывецкага гандлю прысутнічае ва ўсіх буйных населеных пунктах, даючы магчымасць працаўладкавання мясцоваму насельніцтву, а таксама даючы магчымасць рэалізоўваць прадукцыю з асабістых падсобных гаспадарак.

— Мы маем каля 130 пунктаў прыдарожнага сэрвісу на ўсіх найбуйнейшых магістралях краіны. Акрамя таго, працуюць 12 заводаў па вытворчасці мінеральнай і негазіраванай пітной вады, салодкіх і іншых напояў. Вядзецца работа па аўтаматызацыі бізнес-працэсаў у сістэме. У 600 крамах усё аўтаматызавана, але летась мы пачалі аб'ядноўваць іх у адзіную сетку, ствараць адзіны гандлёвы прадукт. Зрабілі рэбрэндынг гандлёвых пунктаў, памянялі іх фармат. За мінулы год адкрылася 155 новых крам. Дарэчы, цэны ў нас не вышэйшыя, чым у любым гандлёвым цэнтры, часам нават і ніжэйшыя. З прычыны папулярнасці экалагічна чыстай прадукцыі даём магчымасць набываць такія тавары з адносна нізкага цэнавага сегмента, прыцягваючы большую колькасць пакупнікоў.

Разам з тым рэнтабельнасць сістэмы спажывецкай кааперацыі па выніках года склала 0,1 працэнта. Аднак Белкаапсаюз не плануе зачыняць магазіны ў невялікіх населеных пунктах. «Зрабіць гэта — значыць паставіць маленькі крыжык на населеным пункце, бо для насельніцтва такія паслугі вельмі важныя. Таму ўтрымліваем гэтыя крамы, даплачваючы прадаўцам за кошт іншых відаў дзейнасці сістэмы спажывецкай кааперацыі», — дадаў спікер.

Актуальным пытаннем на сёння з'яўляецца і эфектыўная работа з сезоннымі прадуктамі. Сёлета Белкаапсаюз экспартаваў у Расію каля 90 тон клубніц — высакаякасных ягад, закупленых як у жыхароў Лунінецкага раёна, так і ў фермерскіх гаспадарак Брэсцкай вобласці. Сярод іх — Драгічынскі, Баранавіцкі, Іванаўскі раёны. Пра гэта расказала **начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДАР:**

— Сёлета з-за эпідэміі паўсталі некаторыя цяжкасці з экспартам клубніц, у тым ліку праз абмежаванні, якія ўвёў расійскі бок. Да таго ж надвор'е пагоршыла ўмовы для нарыхтоўкі гэтай ягады. Тым не менш разлічваем захаваць аб'ёмы мінулага года. Частка ягады цяпер перапрацоўваецца для вінзаводаў, на сокі, для кансервавых прадпрыемстваў. Таксама ўжо праведзена дагаворная работа з рознымі перапрацоўчымі прадпрыемствамі дзікарослай прадукцыі, вызначаны аб'ёмы паставак, часткова абмуёвулены цэны і гэтак далей. Сёлета чакаецца добры ўраджай чарніц, — умовы надвор'я спрыяюць вядзенню іх нарыхтовак. Уся работа па арганізацыі такой дзейнасці для сезону масавай закупкі сельскагаспадарчай і дзікарослай прадукцыі традыцыйна праводзілася загадзя, з зімы. На сёння цяжка сказаць, якая складзецца экспартная цана, але па закупачнай на тэрыторыі краіны мы ўжо вызначаемся — пакуль яна будзе не ніжэйшая за 2-3 рублі за кілаграм свежых ягад.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Магчымасці для дзяцей з глыбінкі



**Наталля КАЛІНОЎСКАЯ, дырэктар Брэсцкага абласнога ліцэя імя П. М. Машэрава:**

— Штодня прагледваючы самыя розную інфармацыю ў сеціве, я заўсёды маю на ўвазе, які ўплыў усё гэта можа мець на свядомасць маіх вучняў ды іх равеснікаў. Згадзіцеся, вельмі дрэнна выхоўваць моладзь на негатыве. А мы з вамі павінны навучыць нашых дзяцей дабрыні, умennю праяўляць павагу і спагаду, навучыць іх думаць і разважаць, бо без гэтага не бывае паўнацэннай асобы і свядомага грамадзяніна. А інтэрнэт, на жаль, апошнім часам ледзь не разрывае ад фэйкаў, чарноцця і адкрытай злосці.

Дык вось, і апанентаў, і прыхільнікаў я заклікаю разам успомніць, колькі station ўчых перамен адбылося ў краіне за апошнія гады і дзесяцігоддзі, як вырасла яна ў сваім сацыяльна-эканамічным развіцці. А колькі магчымасцяў адкрывае дзяржава для моладзі, можна праілюстраваць на прыкладзе нашага ліцэя. Абласны ліцэй — гэта магчымасць для адораных дзяцей з Брэстчыны, хлопчыкаў і дзяўчынак нават з самых аддаленых вёсак атрымаць якасную адукацыю.

У нашым ліцэі навучаецца 75 працэнтаў дзяцей з населеных пунктаў вобласці. Для іх пры навучальнай установе ёсць камфортны інтэрнат, за кошт бюджэту яны забяспечаны 4-разовым харчаваннем. Штогод мы рамантуем памяшканні інтэрната і вучэбнага корпуса, купляем абсталяванне і мэблю зноў жа за бюджэтныя грошы. Некаторыя бацькі — так было на Дні адкрытых дзвярэй, — калі дазнаваліся пра ўмовы пражывання і навучання, называлі гэтую з'яву «камунізмам» і выказвалі жаданне аддаць дзяцей на навучанне. Мы рады таленавітым, матываваным на вучобу школьнікам. Па выніках уступных іспытаў у ліцэй паступаюць найлепшыя, і мы ганарымся сваімі выпускнікамі. Ад 95 да 100 працэнтаў нашых дзяцей становяцца студэнтамі ВНУ, абсалютная большасць з іх паступае на бюджэтную форму навучання.

Як вядома, інвестыцыі ў адукацыю моладзі — гэта і ёсць клопат пра будучыню. А магчымасці для дзяцей з глыбінкі грунтоўна падрыхтавацца і стаць студэнтамі нават самых прэстыжных навучальных устаноў красамоўна сведчаць аб прыярытэтах дзяржавы.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Іран скараціў здабычу нафты да мінімуму за апошнія 40 гадоў



Зніжэнне адбылося, таму што рэзервуары для захоўвання сыравіны, а таксама судны-сховішчы амаль цалкам запоўненыя пасля рэзкага падзення экспарту і зніжэння аб'ёмаў перапрацоўкі «чорнага золата», што было выклікана пандэміяй каранавіруса COVID-19, перадае Reuters. Па звестках інфармагенцтва, якое спасылаецца на свае крыніцы, у чэрвені здабыча сыравіны ў Іране склала ўсяго 1,9 мільёна барэляў, што з'яўляецца паловай ад узроўню здабычы ў краіне за той жа перыяд 2018 года. Разам са здабычай істотна скарацілася і перапрацоўка нафты. У прыватнасці, у маі нафтаперапрацоўка знізілася да 1,4 мільёна барэляў у дзень з 1,5 мільёна ў красавіку. Пры гэтым у пачатку года яна складала амаль 2 мільёны барэляў.

## У Японіі праз паводку загінулі і прапалі без вестак дзясяткі чалавек



У выніку залеў, якія выклікалі паводкі і апоўзні на паўднёвым захадзе Японіі, загінула каля 60 чалавек. Па звестках мясцовых СМІ, яшчэ 17 лічацца зніклымі без вестак. Моцны дождж абрынуўся на востраў Кюсю на паўднёвым захадзе Японіі. У прэфектуры Оіта выйшлі з берагоў дзве ракі. Уладам яшчэ трэба будзе ацаніць шкоду ў некаторых раёнах. Ратавальнікі працягваюць пошукі зніклых. Між тым метэаролагі папярэджваюць пра паводкі і апоўзні ў цэнтральнай і заходняй частках Японіі. Японскае метэаралагічнае агенцтва выпусціла экстраннае папярэджанне аб моцных даждах у некаторых раёнах прэфектур Гіфу і Нагана. Адзначаецца, што тут зафіксаваныя ападкі, якіх не было ўжо некалькі дзесяцігоддзяў.

# «Перамаглі, адбудавалі нашу краіну і крочым далей у будучыню...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведамілі аўтары, раней у ткацкіх выявах наўрад ці былі зваршчыкі альбо айцішнікі. А на гэтым палатне яны ёсць. І, канешне, земляробы, будаўнікі, навукоўцы і дзеячы культуры. Нечакана, можна сказаць, у апошні момант, мастак дабавіў вобраз ваеннай медсястры.



**Тэхніка ўнікальных габеленаў Алены Шунейкі ў традыцыі падвойнага і пераборнага аднабаковага ткацтва з'яўляецца элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны і ўнесена ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. І гэта далёка не адзіны такі прыклад.**

— Яўген Шунейка прыехаў з гатовым эскізам, мы разгаварыліся. І я расказала, што мая прабабуля, Марыя Фёдараўна Барадзіна, ветэран вайны, была медыцынскай сястрой. Так з'явілася на палатне медыцынская ваенная медсястра, хоць на самім эскізе яе не было. А на палатне ўжо ёсць. Для мяне гэта было вельмі сімвалічна. Я сама ткала гэтую частку з выявай маёй бабулі, — з хваляваннем паведаміла маладая **ткачыха Юлія БАРАДЗІНА.** — Гэта маё першае палатно, і калі мяне запрасілі ўдзельнічаць у прекце, я з радасцю згадзілася.

А вось для Яўгена Шунейкі і яго сястры Алены ткацтва — справа сямейная, прычым не аднаго пакалення. Іх бацька, Фелікс Шунейка, у 50-я гады мінулага стагоддзя быў вядомы майстар на Гродзеншчыне. Ён не толькі сам ткаў, але і шукаў па вёсках ткачых, каб папулярызаваць гэтае рамяство. Дарэчы, у сучасным габелене значная частка нітак, якія некалі фарбаваў Фелікс Шунейка. А яшчэ ён удасканаліў ткацкі станок пад вертыкальныя габелены. На традыцыйным станку аснова кладзецца гарызантальна, так ткуць посцілкі альбо ходнікі ці ручнікі. Для габеленаў зручней вертыкальнае ткацтва, бо адразу відаць, як кладзецца ўзор.

Сюжэт гродзенскага габелена прапанаваў Яўген Шунейка, які таксама ўмее добра ткаць, а зараз з'яўляецца прафесарам кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва Беларускай акадэміі мастацтваў. А яго сястра са сваёй вучаніцай увасобілі праект у жыццё. Праўда, раней вялікія габелены ткалі ў шэсць рук, гродзенкі працавалі ў чатыры рукі і свой твор у тэхніцы пераборнага ткацтва выканалі за 151 дзень. Кажуць, што гэта надзвычай рэкордны тэрмін.

— Наш габелен назвалі «Гісторыі жывая ніць». Бо гісторыя — гэта падмурак свядомасці чалавека. Мы ўдзячныя людзям, якія здабывалі Перамогу. А мы павінны гэтую незалежнасць захаваць. Захаваць традыцыі, культуру, каб свет ведаў, што жывуць такія працавітыя беларусы, зычлівыя, якія любяць свой край, сваю мову, свае карані. Менавіта гэта мы імкнуліся перадаць праз палатно, — агучвае сваё бачанне твора вопытная ткачыха.

Алена займаецца ткацтвам больш за 40 гадоў, і гэта не першы яе вялікі габелен. Адзін з іх — «Вясна ў Прынёманні» — упрыгожвае фае абласнога метадычнага цэнтра. Майстрыха пераасэнсоўвае мясцовыя традыцыі і стварае свае арыгінальныя сюжэты і кампазіцыі, дзе можна ўбачыць і помнікі архітэктуры, і сюжэты на духоўную тэму, і пейзажы. Тэхніка ўнікальных габеленаў Алены Шунейкі ў традыцыі падвойнага і пераборнага аднабаковага ткацтва з'яўляецца элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны і ўнесена ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. І гэта далёка не адзіны такі прыклад.

Як расказала **дырэктар Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Алена МУРЭНЯ**, у спіс носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўнесена белаўзорыстае ткацтва Панямоння, якое ўзнавілі і захоўваюць у Лідскім раёне. Традыцыйныя ткацкія тэхнікі шматкаляровых пакрывалаў і дыванаў развіваюць у аграгарадку Парагодна Ваўкавыскага раёна. Падвойныя ці гродзенскія дываны распаўсюджваюць майстры з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна. У спісе спадчыны таксама простае двухнітовае ткацтва Ваўкавыскага раёна — у такой тэхніцы стваралі ўніверсальныя від тканіны, з якой калісьці шылі адзенне, ткалі ручнікі, палавікі і посцілкі.

Што да новага габелена «Гісторыі жывая ніць», ён будзе вандраваць па Беларусі і выстаўляцца ў музеях ці іншых культурных установах.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

---

Па той бок злачынства

# ПРАЧЫТАЦЬ ПА КРОПЛІ КРЫВІ

## Медыцынскі судовы эксперт пра асаблівасці прафесіі, рэзанансныя справы і даследаванні на генным узроўні

**Некалькі гадоў таму Магілёў ускалыхнула навіна пра жорсткае забойства прадпрымальніка. Зніклага мужчыну шукалі родныя, міліцыя і нават экстрасэнсы. Пры першасным аглядзе дома, дзе ён жыў, нічога падазронага не знайшлі, але калі на месца здарэння выехалі спецыялісты ўпраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці, карціна праяснілася. Было знойдзена некалькі кропель крыві, якія, па сутнасці, указалі на крымінальны след здарэння. Падазраваныя ў рэшце рэшт прызналіся, што забілі прадпрымальніка і зацэментавалі яго ў падлогу гаража.**

### ЗАБОЙЦУ ВЫДАЛА... ШКАРПЭТКА

**Марыя ДРАНІЦА, намеснік начальніка ўпраўлення лабараторных даследаванняў рэчавых доказаў біялагічнага характару УДКСЭ па Магілёўскай вобласці,** можа расказаць шмат гісторый пра тое, як раскрываліся гучныя крымінальныя справы. Які б хітры і асцярожны ні быў злачынец, усё роўна знойдзецца дробязь, якая яго абавязкова выдасць, — валасы, сляды поту або сліны, любы іншы клетачны матэрыял, на аснове якога можна будзе ідэнтыфікаваць яго і прыцягнуць да адказнасці.

Не менш рэзананснае было злачынства ў Глуску, калі зніклі 30-гадовая жанчына і яе трохмесячная дачка. Пра гэта міліцыі паведаміў сужыцель пацярпелай, які асабіста ўдзельнічаў у пошуках, а потым высветлілася, што менавіта ён і быў забойцам.



— Наш эксперт знайшоў па месцы жыхарства мужчыны шкарпэтку са слядамі крыві, па якой было ўстаноўлена, што кроў належыць менавіта зніклай жанчыне, — расказвае Марыя Андрэеўна. — Потым абвінавачаны сам паказаў, дзе закапаў сваіх ахвяр.

Цяжэй даводзіцца, калі клетачны матэрыял, сабраны на месцы злачынства, няма з чым ідэнтыфікаваць. Але гэта не значыць, што правапарушальнік можа спаць спакойна.

— Генетычныя характарыстыкі знойдзенага матэрыялу мы змяшчаем у базу АІС «ДНК», і рана ці позна злачынец абавязкова там «засвеціцца», — кажа суразмоўніца. — Напрыклад, нядаўна раскрыты крадзеж, які быў здзейснены некалькі гадоў таму ў Асіповіцкім раёне. Мужчыну затрымалі, і высветлілася яго дачыненне да нераскрытай справы.

### НА ЭКСПЕРТЫЗУ ПРОСТА З РАДДОМА

Платныя экспертызы па заявах ад насельніцтва або па судовых пастановах — яшчэ адзін кірунак работы дзяржаўных судовых экспертаў УДКСЭ па Магілёўскай вобласці. Асноўнае пытанне — высвятленне бацькоўства. У сярэднім да экспертаў паступае прыкладна пяць-шэсць такіх матэрыялаў на тыдзень. Бывае, што да экспертаў звяртаюцца адразу ж з раддома, калі на дзіця нават яшчэ няма пасведчання аб нараджэнні. Мужчына гатовы прызнаць сваё бацькоўства, але крыху сумняваецца. Тады спецыялісты праводзяць экспертызу. У гэтым выпадку ўсё абыходзіцца без судовых цяжбаў. Цяжэй бывае зразумець тых бацькоў, якія ўстанаўліваюць сваё дачыненне да нараджэння ўжо дастаткова дарослых дзяцей: незразумела, што рухае чалавекам, якога дзіця гадоў восем або дзесяць называла бацькам.

### ПРА ЎСЁ РАСКАЖУЦЬ ГЕНЫ

Калі ў выпадку з устанаўленнем бацькоўства праблем з клетачным матэрыялам не бывае, то ў крымінальных справах ён здабываецца вельмі складана. Спецыяліст ДКСЭ павінен знайсці яго на месцы здарэння, а потым зняць шляхам саскрэбу, выразання, змыву. У лабараторных умовах «узломваюцца» клетачныя абалонкі, каб атрымаць доступ да ДНК. Пры дапамозе ПЛР колькасць копій ДНК, неабходных спецыялісту для даследавання, штучна павялічваецца, затым усё гэта змяшчаецца ў спецыяльны аналізатар. Праграмнае забеспячэнне дазваляе прааналізаваць інфармацыю і расшыфраваць генатып.



— Маючы на руках генатып чалавека або генетычныя сляды з месца здарэння, мы можам іх параўноўваць, — расказвае судмедэксперт. — У кожнага з нас генатып унікальны, індывідуальны і аднолькавы ва ўсіх тканках арганізма. На працягу жыцця ён не мяняецца.

Дарэчы, што датычыцца ўстанаўлення бацькоўства, то там аналіз праводзіцца крыху інакш. Генатып дзіцяці, як вядома, фарміруецца з храмасом маці і бацькі. Калі спецыялісты не знаходзяць там храмасом бацькі, бацькоўства выключаецца.

### ГАЛОЎНАЕ — АБСТРАГАВАЦЦА

У галаве ўсплываюць гісторыі адна за другую страшнейшыя, жорсткасць ліхадзеяў не паддаецца ніякаму разуменню. Можна сабе ўявіць, што даводзіцца перажываць тым людзям, якім гэта ўсё неабходна даследаваць. Судовыя эксперты ДКСЭ якраз і знаходзяцца на той самай «перадавой», дапамагаюць следчым фарміраваць доказную базу.

— Заўсёды страшна, калі ўнікаеш у абставіны якога-небудзь злачынства, — кажа Марыя Драніца. — Мы стараемся абстрагавацца і не думаць, што стаіць за тымі аб'ектамі, якія мы даследуем, каб захаваць сябе яшчэ і для сям'і, і для сяброў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва УДКСЭ па Магілёўскай вобласці.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
9 ЛІПЕНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15889)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

Дар'я МАТРОСАВА:

# «ШЧАСЛІВАЯ ШТОДЗЕНЬ ЗАЙМАЦЦА ФАТАГРАФІЯЙ»

**Яна неаднаразовая пераможніца і прызёрка прэстыжных міжнародных фотаконкурсаў International Photography Awards у Лос-Анджэлесе і MIFA ў Маскве, Prix de la Photography–2019 у Парыжы. Яе работы можна ўбачыць на цэнтральнай станцыі метро ў Барселоне, еўрапейскіх выстаўках, шматлікіх вокладках сусветнага глянцу. Сёлета Дар'я Матросава прызнана «Найлепшым прафесійным еўрапейскім фатографам — 2020» па выніках конкурсу Федэрацыі еўрапейскіх фатографаў сярод больш як дзвюх тысяч прафесійных здымкаў з 29 краін. Да таго ж, гераіня — першая жанчына, удастоеная такога звання.**



***— Дар'я, якая з работ для вас самая значная?***

— Серыя графічных фатаграфій «Акцэнты і формы», якая і была адзначана як найлепшая ў конкурсе Федэрацыі. У яе шмат сусветных прэстыжных узнагарод, і тыя, хто не знаёмы з маёй творчасцю і ўпершыню заходзяць на мой сайт, заўсёды адзначаюць іх. Думаю, прыцягвае простата і вытанчанасць формаў. Іх здымка прайшла яшчэ ў 2017 годзе, і ўжо падчас падрыхтоўкі я зразумела, што будзе «вау»-эфект. Але так бывае не заўсёды, і фатографам-навічкам трэба ведаць аб тым, што ў любы момант кадр можа атрымацца зусім не такі, як задумваўся спачатку. Калі гаварыць пра вышэйназваны конкурс, то спачатку я перамагла ў сваёй намінацыі, а затым і сярод усіх. Цырымонія ўзнагароджання павінна была прайсці ў Рыме, аднак з-за каранавіруса адбылася ў анлайн-рэжыме.

***— Ці думалі вы ў дзяцінстве, што будзеце цесна звязаны з фатаграфіяй?***

— Усё маё жыццё так ці інакш звязана з мастацтвам. З малых гадоў мама вучыла маляваць, мне гэта вельмі падабалася. Калі прыйшоў момант вызначацца з прафесіяй, для мяне было зразумела, чаму аддам прыярытэт. Паступіла ў Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава на мастацка-графічны факультэт і нават не здагадвалася, што буду займацца фатаграфіяй. Зразумела, я была сярод творчых маладых людзей, таму захацелася паспрабаваць нешта новае для сябе. На трэцім курсе купіла вельмі дарагую камеру і... атрымала вялікі стрэс, бо не ведала, што з ёй рабіць. Як і многія, здымала ўсё, што бачыла: вуліцы, твары, нават адпрацавала на некалькіх вяселлях, пасля чаго з'явілася ўпэўненасць: гэта дакладна «не маё». Усё змяніла першая мастацкая фотасесія, якую арганізавала, будучы на пятым курсе. Прыйшло разуменне: у маіх работах павінна быць нешта большае, чым удала злоўленае імгненне. З таго часу заўсёды сумяшчаю жывапіс з фатаграфіяй, атрымліваюцца канцэптуальныя і эксперыментальныя здымкі. Лічу, што менавіта гэта і прыцягвае да маіх работ, іх стварэнне — гэта цэлае мастацтва.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Камандны дух*

# ІХ НАЗВАЛІ АТЛАНТАМІ

**У студэнцкіх атрадах БРСМ у разгары трэці працоўны семестр. У рамках маштабнага маладзёжнага вытворчага праекта сумесна з буйным прадпрыемствам краіны — ЗАТ «Атлант», пачынаючы з 1 ліпеня больш за 500 студэнтаў з ВНУ Беларусі і Расіі прыступілі да работы на аб'ектах Мінскага завода халадзільнікаў. Там хлопцы і дзяўчаты працуюць у якасці слесараў-зборшчыкаў бытавой тэхнікі. Пра ўражанні студэнтаў пасля амаль двух працоўных тыдняў мы распыталі ў некаторых байцоў незвычайнага студатрада.**



Студатрад «Эйфарыя».

Дваццацідвухгадовая **Крысціна ХУБУЛАВА,** чацвёртакурсніца Сібірскага ўніверсітэта фізічнай культуры і спорту — камандзір праекта «Атлант-2020». У студатрадаўскім руху дзяўчына ўжо чатыры гады, заўсёды займала адказныя пасады камандзіра або камісара розных праектаў, прызнаецца, што гэта ёй вельмі падабаецца. Вось і сёлета Крысціна разам з камісарам **Кірылам РАМАНАВЫМ,** студэнтам-чацвёртакурснікам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, курыруюць 12 зводных атрадаў на прадпрыемстве.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Жыві і квітней, Беларусь! Маладосць на маршы

# З «БАЗАЙ» У ГАЛАВЕ

## Прыступкі поспеху юных айцішнікаў

**Экзамены ў школах даўно скончыліся. Цяпер былыя вучні штурмуюць новыя вяршыні свайго жыцця. Многія хлопцы і дзяўчаты ўжо даўно ведаюць, куды будуць паступаць, кім хацелі б працаваць. Сярод іх — і прэзідэнцкія стыпендыяты з горада, дзе нарадзіўся Марк Шагал. Мы сустрэліся з экс-адзінаццацікласнікамі Аляксеем УЛЬЯНАВЫМ і Яраславам БАРЫСАВЫМ — неаднаразовымі пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд.**



Яраслаў БАРЫСАЎ і Аляксей УЛЬЯНАЎ *(справа).*

Фота Алега КЛІМОВІЧА.

**Дырэктар віцебскай гімназіі № 8 Раіса ГРАБОЎСКАЯ** кажа, што колькасць такіх жа стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў сярод тых, хто вучыцца або вучыўся ў іх, перавышае восемдзесят. Тлумачыць, што сакрэт поспеху — у самааддананасці педагогаў: яны прафесіяналы з вялікай літары. І пацвярджэнне гэтаму — вучні, якія заваёўваюць на прадметных спаборніцтвах медалі. Перад інтэрв'ю замест аднаго патэнцыяльнага суразмоўніка дырэктар параіла адразу дваіх. Малайцы хлопцы, самі здагадаліся прынесці паказаць свае «трафеі». Сказалі, што гэта не ўсе, а самыя, на іх погляд, «важныя». З вельмі ветлівымі, эрудзіраванымі, не сумнымі людзьмі даволі хутка, як кажуць, апынуліся на адной хвалі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Выбар маладых*

# ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ ГАЛАСУЮЦЬ ЗА СВАЁ

## Папулярнасць і пазнавальнасць беларускіх брэндаў расце



Фота з адкрытых крыніц.

**Пра гэта сведчаць вынікі сацыялагічнага даследавання «Маладзёжны брэнд — 2020», арганізатарамі якога выступілі ТАА «БелБрэндАўдыт» і Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый.**

### СІГНАЛ ДЛЯ ВЫТВОРЦАЎ

Рэспубліканскае сацыялагічнае даследаванне «Маладзёжны брэнд» прайшло ў 25 населеных пунктах Беларусі сёлета ў красавіку-маі і ахапіла больш за 1,2 тысячы маладых беларусаў ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў. Яго мэтай было выяўленне папулярных у маладзёжным асяроддзі беларускіх і замежных брэндаў, а таксама вывучэнне таго, чаму аддаюць перавагу пакупнікі.

Для збору інфармацыі быў выкарыстаны метад анлайн-апытання. Як адзначыў **старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый Павел АЛЕКСА,** даследаванне хоць і праводзілася ўжо пяты раз, але ў анлайн-фармаце — упершыню. «Гэта было прадыктавана дзвюма прычынамі: складанай эпідэміялагічнай абстаноўкай, выкліканай пандэміяй каранавіруса, і спецыфікай маладзёжнай аўдыторыі (цяпер ва ўсіх ёсць сучасныя гаджэты і тэхналагічныя сродкі сувязі). Анлайн-фармат аказаўся больш простым, хуткім і эфектыўным, — заўважыў ён. — Таму ў будучыні, мяркую, мы будзем выкарыстоўваць менавіта яго».

**Дырэктар ТАА «БелБрэндАўдыт» Валянціна ДЫНІЧ** канстатуе: увага да беларускіх брэндаў расце.

— Падчас апошняга даследавання гэта адчувалася асабліва. Нават тыя пазіцыі, на якіх на працягу некалькіх гадоў знаходзіліся замежныя вытворцы, цяпер занялі нашы кампаніі. Мне здаецца, што даследаванне — добры інфармацыйны базіс, на якім нашы прадпрыемствы і арганізацыі могуць больш канструктыўна і адэкватна выбудоўваць сваю палітыку і пазіцыю па прасоўванні беларускіх тавараў. Моладзь заўсёды адыгрывае важную ролю ў грамадстве. А праз некаторы час роля маладых яшчэ ўзмоцніцца, калі юнакі і дзяўчаты будуць займаць ужо новыя пазіцыі на сваіх рабочых месцах, у тым ліку кіруючыя. І ад таго, наколькі яны зараз цэняць сваё, беларускае, залежаць іх рашэнні ў будучыні па прасоўванні і папулярызацыі беларускіх тавараў, — адзначыла Валянціна Дыніч.

### ПРАЦУЕМ НАД ПАЗНАВАЛЬНАСЦЮ

— Мы прапанавалі маладым людзям адказаць на пытанні пра папулярнасць і вядомасць розных беларускіх брэндаў у нашай краіне і за мяжой. І такім чынам атрымалася скласці рэйтынг брэндаў на аснове праведзенага апытання, — дадала **выканаўчы дырэктар ТАА «БелБрэндАўдыт» Ніна КАЛІТА.** — Рэйтынгі беларускіх брэндаў на цяперашні момант не складаюцца. У інтэрнэце можна знайсці толькі звесткі рэйтынга ста беларускіх брэндаў аднаго ўкраінскага агенцтва, якое па сваёй пэўнай тэхналогіі падлічвае рынкавы кошт брэндаў з фокусам на іх інвестыцыйную прывабнасць, але без уліку іншых актываў. Рэйтынгі, складзеныя па выніках праекта «Маладзёжны брэнд», заснаваныя на даных сацыялагічнага даследавання. Швейцарскія гадзіннікі, італьянскі абутак, французская касметыка... Пры іх згадванні ва ўсіх нас з'яўляюцца пэўныя асацыяцыі. Але і беларускія тавары не менш якасныя — проста трэба больш працаваць над іх пазнавальнасцю.

Пры складанні анкеты на першае месца было пастаўлена пытанне аб папулярнасці і вядомасці менавіта беларускіх брэндаў: рэспандэнты называлі тыя з іх, пра якія падумалі ў першую чаргу.

— Паняцці «вядомасць» і «папулярнасць» — розныя рэчы, — падкрэслівае Ніна Каліта. — Вядомасць набываецца па нейкіх аб'ектыўных прычынах. Гандлёвая марка можа быць непапулярная ў наш час, затое добра вядомая. Пры фармулёўцы пытанняў мы канкрэтызавалі: ці лічыце вы пэўны брэнд папулярным або вядомым? Звярнулі ўвагу на тое, што з году ў год і папулярнасць, і пазнавальнасць беларускіх брэндаў сярод моладзі расце.

На падставе прааналізаваных адказаў на тры пытанні («Назавіце найбольш папулярны беларускі брэнд», «Якія беларускія брэнды з пералічаных далей вы лічыце папулярнымі» і «Адзначце ў слупку самы(-я) вядомы(-я) у краіне беларускі брэнд» ) можна зрабіць наступныя высновы. На першым месцы па папулярнасці сярод беларускіх брэндаў стаіць кандытарская фабрыка «Камунарка», паколькі большасць рэспандэнтаў лічаць яго папулярным (66,1 працэнта) і вядомым (63,5 працэнта). Таксама значная колькасць рэспандэнтаў (13,9 працэнта) згадалі «Камунарку» ў адкрытым пытанні пра папулярнасць беларускіх брэндаў. На другім месцы размясціўся брэнд «Савушкін прадукт»: папулярным яго лічаць 53,2 працэнта рэспандэнтаў, а вядомым — 44,6 працэнта. Трэцяе месца займае Mark Formell: палова апытаных лічаць яго папулярным і значная частка (40,6 працэнта) — вядомым. На чацвёртым месцы знаходзіцца брэнд «Санта Брэмар», пяты радок займае «Спартак».

### САМАЕ СМАЧНЕНЬКАЕ

Падчас сацыялагічнага даследавання маладым людзям было прапанавана вызначыць самыя папулярныя брэнды ў групе харчовых і прамысловых тавараў.

Пяцёрка лідараў у мясной прадукцыі выглядае наступным чынам: першае месца — «Брэсцкі мясакамбінат», другое — Віцебская птушкафабрыка («Ганна»), трэцяе — «Ваўкавыскі мясакамбінат», чацвёртае — «Сервалюкс» («Пятруха», «Мішуткі», «Мясоградзь») і пятае — Бярозаўскі мясакамбінат.

У катэгорыі «Рыба і морапрадукты» перамагла прадукцыя «Санта Брэмар». Далей па папулярнасці ідуць VICI, «Эканом Маркет», «Віталюр» і «Шхуна».

У катэгорыі «Малочная прадукцыя» на першай пазіцыі размясціўся брэнд «Савушкін прадукт», далей — «Брэст-Літоўск», «Беллакт», «Бабуліна крынка» і «Ласкавае лета».

У намінацыі «Марожанае» на першых пяці пазіцыях — брэнды «ТОП», Soletto, «20 капеек», «Юкі» («Трыа», «Кароўка») і «Пламбір 20 капеек».

У намінацыі «Шакалад, цукеркі і прысмакі» самай папулярнай аказалася прадукцыя Alpen Gold. Ёй саступілі і «Камунарка», і «Спартак». На чацвёртай пазіцыі — брэнд Kinder, а замыкае пяцёрку прадукцыя Roshen.

Сярод кандытарскіх вырабаў на першай пазіцыі апынуўся «Слодыч», далей «Яшкіна» , «Спартак», 7Days і «Барні».

### «БЕЛІТА» ВЫЦЯСНЯЕ КАНКУРЭНТАЎ

У катэгорыі «Адзенне» ў моладзі лідзіруюць тавары маркі MarkFormelle і LC WAIKIKI. Таксама ў спісе тавараў, якія выбіраюць хлопцы і дзяўчаты, прысутнічаюць Conte, De Facto, Colin, «ТВОЕ», Zara, «Світанак», Mango і «Мілавіца».

У катэгорыі «Абутак» на першай пазіцыі сярод брэндаў стаіць прадукцыя Marko. Другое і трэцяе месца адпаведна займае абутак Megatop і Kari. У дзясятку ўвайшлі таксама Belwest, Basconi, Converse, Baldinini, Caprice, Basta і Ecco. Што датычыцца пакупніцкіх пераваг, то значная частка апытаных маладых людзей часцей за ўсё за апошнія паўгода набывалі абутак Marko (пра гэта паведамілі 23 працэнты рэспандэнтаў), Megatop (14,4 працэнта) і Kari (13,7 працэнта).

Пяцёрка лідараў у вытворчасці спартыўнага адзення і абутку выглядае наступным чынам: першае месца — Adidas, другое — Nike, трэцяе — Puma, чацвёртае — Reebok і пятае — Mark Formelle. Далей па папулярнасці ідуць Asics, Columbia, New Balance, «Світанак» і Champion.

Сярод вытворцаў касметыкі першым брэндам для моладзі з'яўляецца «Беліта-Вітэкс». Другое і трэцяе месцы адпаведна займаюць Dove і Nivea. У дзясятку ўвайшлі таксама Adidas, Gillette, Rexona, Elseve, Garniere, Eveline і Head&Shoulders.

### ІДЗЕМ ПА ПАКУПКІ!

Прадметам даследавання стала таксама папулярнасць у маладзёжным асяродку гандлёвых сетак. Большасць рэспандэнтаў (88 працэнтаў) паведамілі, што пастаянна іх наведваюць. Пры аналізе спажывецкіх паводзінаў назіраецца наступная тэндэнцыя: часцей за ўсё за апошнія паўгода рэспандэнты здзяйснялі пакупкі ў сеткавых крамах «Еўраопт» (58,8 працэнта), «Віртраў чысціні і смаку» (44,9 працэнта), «Міла» (34 працэнты), Green (25,3 працэнта) і «Алмі» (24,7 працэнта).

Але па папулярнасці моладзь расставіла брэнды наступным чынам: на першай пазіцыі «Еўраопт», далей «Віртраў чысціні і смаку», Green, «Алмі», «Міла», «Дабраном», «Карона», «Белмаркет», «Санта» і «AMI утульны дом».

У цэнтры ўвагі даследавання аказаліся таксама і банкаўскія паслугі. Большасць рэспандэнтаў (88,8 працэнта) паведамілі, што яны карыстаюцца паслугамі банкаў. Першыя тры згаданыя банкаўскія ўстановы былі наступныя: Беларусбанк (78,8 працэнта), Белаграпрамбанк (23 працэнты) і Белінвестбанк (14,8 працэнта).

Пры аналізе спажывецкіх паводзінаў у адносінах да банкаў назіраецца наступная тэндэнцыя: часцей за ўсё за апошнія паўгода рэспандэнты карысталіся паслугамі Беларусбанка (74,8 працэнта), далей ідзе Белаграпрамбанк (24,2 працэнта), на трэцім месцы — Белінвестбанк (15,3 працэнта), на чацвёртым і пятым месцах — Альфа-банк (13,4 працэнта) і Белгазпрамбанк (10,2 працэнта).

А дзясятка лідараў выглядае наступным чынам: Беларусбанк, Белаграпрамбанк, Белінвестбанк, Альфа-банк, Белгазпрамбанк, Пріорбанк, МТБанк, БПС – Ашчадбанк, Банк ВТБ і Банк Дабрабыт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*І сабе, і людзям*

# ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ — 2020 ПАЧАЎСЯ Ў ДЗЕНЬ МОЛАДЗІ

**28 чэрвеня на плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь адбылося афіцыйнае адкрыццё трэцяга працоўнага семестра — 2020, прысвечанага 75-годдзю Вялікай Перамогі.**



Фота БелТА.

Ва ўрачыстай цырымоніі ўручэння працоўных пуцёвак студэнцкім атрадам прынялі ўдзел каля 400 прадстаўнікоў студатрадаўскага руху з розных рэгіёнаў краіны, у тым ліку зводныя атрады працоўных праектаў гэтага года: «Усебеларуская маладзёжная будоўля «Горад маладосці» (г. Астравец, Беларуская АЭС) і «Атлант-2020».

У Дзень моладзі на адрас удзельнікаў папулярнага маладзёжнага працоўнага руху прагучалі сказаныя на дарогу словы ад кіраўнікоў Савета Міністраў і Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, якія курыруюць сацыяльную сферу, міністра адукацыі, а таксама першага сакратара Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

У ходзе цырымоніі быў запланаваны парад студатрадаўскіх сцягоў і прэм'ера новай песні руху «Гімн БСА» ў выкананні студэнцкага будаўнічага атрада з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта «Эўрыка» імя Героя Савецкага Саюза Віктара Іванавіча Яроньκі.

Святочная праграма была вельмі насычаная рознымі відамі актыўнасці. Так, на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна» адбылася маладзёжная працоўная акцыя «Працуем разам!». У ходзе мерапрыемства байцы студатрадаў высадзілі ў гонар 75-годдзя Перамогі 75 хвойных дрэў, пафарбавалі дзіцячую пляцоўку, добраўпарадкавалі дарожкі і акопы, дапамаглі ачысціць паверхню тэхнікі ад старой фарбы.

Завяршыў святочны дзень студатрадаўскі квэст і экскурсія па «Лініі Сталіна». Дарэчы, пераможцаў квэста чакаў галоўны прыз — катанне на бранятэхніцы.

Для ўдзелу беларускай моладзі ў студатрадаўскім руху Рэспубліканскім штабам студэнцкіх атрадаў запланавана работа 192 будаўнічых атрадаў на 3068 чалавек, 509 сельскагаспадарчых атрадаў на 11 757 чалавек, 104 педагагічных атрады на 3135 чалавек, 174 экалагічныя атрады на 3062 чалавекі, 413 сэрвісных атрадаў на 6400 чалавек, 27 медыцынскіх атрадаў на 359 чалавек, 147 вытворчых атрадаў на 1889 чалавек.

Падаць заяўку для работы ў трэцім працоўным семестры можна было анлайн у групах БРСМ у сацсетках з выкарыстаннем QR-кода і хэштэгаў #Выбіраем_студотряд!, #Студотряд, #Працуем_разам! і #БСА.

Пачынаючы з сакавіка бягучага года 23 400 чалавек ужо забраніравалі месцы для работы ў студатрадах рознага профілю. Запіс у атрады працягваецца.

З 1 студзеня да 1 ліпеня ў рамках круглагадовай працоўнай занятасці ў складзе 230 атрадаў працаўладкавана 2997 чалавек, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў працаўладкавана 1685 непаўналетніх.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Новыя магчымасці*

## Асабісты кабінет з лічбавым партфоліа

**«Лічбавая прыёмная камісія» створана ў ГрДУ імя Янкі Купалы. Цяпер абітурыенты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта змогуць падаць дакументы і даведацца аб сваім залічэнні ў студэнты ў рэжыме анлайн.**

Абітурыенту неабходна зарэгістравацца на сайце abit.grsu.by, дзе аўтаматычна будзе створаны яго асабісты кабінет. У ім у любы зручны час можна запоўніць анкету абітурыента і загрузіць фатаграфію для студэнцкага білета. Сэрвіс дазваляе прымацаваць электронныя копіі неабходных для паступлення дакументаў. Атрымаўшы сертыфікаты ЦТ, абітурыенту застанецца толькі ўнесці іх вынікі ў анкету.

Пасля праходжання працэдуры праверкі дакументаў прыёмнай камісіяй абітурыент атрымлівае магчымасць раздрукаваць заяву, дагаворы на падрыхтоўку і копіі дакументаў, неабходных для фарміравання асабістай справы. Папярэдне зарэгістраваўшыся ў электроннай чарзе на зручны час, абітурыенту неабходна будзе асабіста падаць арыгіналы дакументаў у прыёмную камісію ГрДУ імя Янкі Купалы ў перыяд з 25 ліпеня да 31 ліпеня — на бюджэтную форму і з 25 ліпеня да 12 жніўня — на платную форму навучання. Вынікі ўступных выпрабаванняў і конкурсная сітуацыя ў рэжыме рэальнага часу будуць адлюстраваныя ў асабістым кабінеце абітурыента.

Сэрвіс «Лічбавая прыёмная камісія», у стварэнні якога прынялі ўдзел супрацоўнікі і студэнты ўніверсітэта, забяспечвае шырокія магчымасці не проста падаць дакументы ў прыёмную камісію для іх папярэдняга вывучэння, але і атрымаць кансультацыі спецыялістаў, азнаёміцца з усімі спецыяльнасцямі Купалаўскага ўніверсітэта і здзейсніць свой выбар, абапіраючыся на сертыфікаты ЦТ. На платформе абітурыент зможа ў рэжыме анлайн пагутарыць з дэканамі і студэнтамі факультэтаў і наведаць карпусы і факультэты ўніверсітэта ў рамках віртуальнай экскурсіі.

Варта адзначыць, што прыёмная камісія ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы ў віртуальнай прасторы працуе ўжо не першы год, і залічэнне ў студэнты праходзіць у электронным выглядзе.

Пасля залічэння ў віртуальнай прасторы ўніверсітэта ў кожнага першакурсніка з'яўляецца свой асабісты кабінет з усёй неабходнай і актуальнай інфармацыяй: доступам да адукацыйнага партала, вучэбных матэрыялаў, паслуг ГрДУ імя Янкі Купалы, а таксама магчымасць фарміравання лічбавага партфоліа для будучага працаўладкавання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Абітурыент–2020*

# СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ, ЗАПАТРАБАВАНЫЯ ЧАСАМ

**Вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі абвясцілі набор на новыя спецыяльнасці, якія звязаны пераважна з тэхналогіямі, праграмаваннем і эканомікай.**

Так, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт у новым навучальным годзе прапануе абітурыентам дзве новыя спецыяльнасці — «Вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій» (інжынерны факультэт) і «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» (факультэт эканомікі і права). Будучых інжынераў прымуць на дзённую форму навучання. Эканамічная праграма мае спецыялізацыю «Машынабудаванне» на дзённай форме і на завочнай скарочанай. На завочным аддзяленні з новага навучальнага года з'явіцца і дыстанцыйная форма навучання па спецыяльнасці «правазнаўства».

**У Палескім дзяржаўным універсітэце створаны пяты факультэт — інжынерны**

На факультэце хімічнай тэхналогіі і тэхнікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта будзе весціся набор на спецыяльнасць «Прамысловая водападрыхтоўка і водаачыстка». На факультэце лясной інжынерыі, матэрыялазнаўства і дызайну БДТУ адкрыецца спецыяльнасць «Лясная інжынерыя і лагістычная інфраструктура ляснога комплексу».

Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт на факультэце эканомікі і бізнес-кіравання на вочнай форме навучання прапануе запатрабаваную спецыяльнасць «Эканоміка электроннага бізнесу». Плануецца, што студэнты будуць вывучаць як эканамічныя, так і тэхнічныя дысцыпліны. Праз чатыры гады выпускнікам будзе прысвоена кваліфікацыя «эканаміст-праграміст».

З 2020 года ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава з'явяцца спецыяльнасці «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі», «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (знешнеэканамічныя сувязі)» і «Руская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская)».

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны адкрывае набор на тры новыя спецыяльнасці: «Прыкладная інфарматыка (праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)», «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (міжнародны турызм)» і «Руская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)».

На дзённай форме навучання ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы абітурыентам прапануюцца чатыры новыя спецыяльнасці: «Штучны інтэлект», «Прамысловыя робаты і робататэхнічныя комплексы ў машынабудаванні», «Дызайн віртуальнага асяроддзя» і «Спартыўна-педагагічная дзейнасць».

На факультэце матэматыкі і прыродазнаўства Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова распачнецца падрыхтоўка па спецыялізацыях «Медыкабіялагічная справа» і «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій». Форма навучання — дзённая. Акрамя вочнай формы, плануецца набор і на завочную скарочаную для тых, хто скончыў каледж па гэтым жа профілі.

У 2020 годзе ў Палескім дзяржаўным універсітэце створаны пяты факультэт — інжынерны, які будзе рыхтаваць кадры для развіцця інжынірынгавага напрамку эканомікі краіны па спецыяльнасцях «Прамысловае рыбаводства (тэхналогія перапрацоўкі рыбнай прадукцыі)», «Інфармацыйныя тэхналогіі фінансава-крэдытнай сістэмы», «Садовапаркавае будаўніцтва (ландшафтнае будаўніцтва)».

Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт на юрыдычным факультэце адкрывае набор на спецыяльнасць «Мытная справа». На старшых курсах можна будзе выбраць спецыялізацыі «Прававое забеспячэнне мытнай дзейнасці», «Эканамічнае забеспячэнне мытнай дзейнасці» і атрымаць кваліфікацыю «Спецыяліст мытнай справы». Форма навучання — вочная.

Новыя і абноўленыя спецыяльнасці і спецыялізацыі з'явяцца і ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Так, на энергетычным факультэце адкрыецца спецыяльнасць «Праектаванне і эксплуатацыя атамных і электрычных станцый». На факультэце тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі на спецыяльнасці «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» створаны новы кірунак — «Эканамічная бяспека прамысловага прадпрыемства».

Акрамя таго, у абітурыентаў з'явіцца магчымасць трапіць на спецыялізацыю «Адытыўныя тэхналогіі ў ліцейнай вытворчасці» ў рамках спецыяльнасці «Машыны і тэхналогія ліцейнай вытворчасці». А ў рамках спецыяльнасці «Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне» з'явіцца новая спецыялізацыя «Інавацыйнае абсталяванне для атрымання прадуктаў з адпрацаваных будаўнічых канструкцый».

На прыборабудаўнічым факультэце на спецыяльнасці «Біятэхнічныя медыцынскія прыборы і сістэмы» будуць адкрыты дзве новыя спецыялізацыі — «Тэхнічныя сродкі дыягностыкі і лячэння» і «Тэхнічныя сродкі замены органаў і рэабілітацыя».

У БНТУ таксама правялі рэбрэндынг спецыяльнасці «Гарадскі электрычны транспарт», і ў 2020 годзе ВНУ будзе ажыццяўляць набор па абноўленай спецыяльнасці «Электрычны і аўтаномны транспарт». А ў наступным годзе плануецца адкрыць новую спецыяльнасць «Прамысловы дызайн» з некалькімі кірункамі: «Дызайн транспартных сродкаў» — на аўтатрактарным факультэце і «Дызайн вытворчага абсталявання» — на факультэце тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Бачыць мэту*

# ДАЛУЧЫЦЦА ДА «ЗЯЛЁНЫХ МАРШРУТАЎ»

**У БДУ вызначылі пераможцаў у адукацыйным конкурсе стартапаў для моладзі Startup Heart. Найлепшай аказалася ініцыятыва TheGreenWay студэнткі гістарычнага факультэта БДУ.**



TheGreenWay скіраваны на папулярызацыю аграэкатурызму ў Беларусі і прадугледжвае стварэнне мабільнай праграмы для самастойных падарожжаў па экалагічных «зялёных маршрутах» краіны. **Магістрантка гістарычнага факультэта БДУ і па сумяшчальніцтве кіраўнік праекта Святлана ДАЛЮК** вывучае тэму экалагічнага турызму ўжо больш за пяць гадоў. Яна расказала, што ідэя стварэння такой інфармацыйнай пляцоўкі з'явілася некалькі гадоў таму:

— Я шмат падарожнічала па розных краінах. Заўважыла, што ў многіх парках ёсць карты і мабільныя праграмы для больш зручных паездак. Падумала: чаму ў нас такога няма? Паступіўшы ў магістратуру, расказала куратару аб сваёй ідэі стварэння мабільнай праграмы, і яна мяне падтрымала.

Яшчэ падчас работы над дысертацыяй Святлана звярнула ўвагу на шэраг праблем, якія стрымліваюць развіццё экатурызму ў краіне. Адна з галоўных — адсутнасць дакладнай інфармацыі аб «зялёных маршрутах», што аб'ядноўваюць разнастайныя прыродныя, этнаграфічныя і культурныя славутасці: унікальныя ландшафты, месцы пражывання рэдкіх жывёл і іншае.

— У Беларусі, на жаль, пакуль што няма адзінай анлайн-базы, дзе былі б прадстаўлены патрэбныя звесткі аб экалагічных сцежках і іншых прыродных аб'ектах. Іх сотні, але не многія пра тое ведаюць, — адзначыла суразмоўніца. — Дарэчы, калі турысты з іншых краін хочуць арганізаваць нейкую паездку, часта сутыкаюцца з тым, што не арыентуюцца ў месцазнаходжанні стаянак уздоўж экамаршрутаў, дзе пры неабходнасці можна пераначаваць. Таму хацелася стварыць бясплатную пляцоўку для аматараў падарожжаў, на якой будуць размешчаны звесткі аб аграсядзібах, славутых гістарычных мясцінах, дамах рамеснікаў, інакш кажучы, з'явяцца комплексныя турыстычныя напрамкі. Кожны з іх будзе суправаджацца апісаннем на рускай і англійскай мовах з фотаздымкамі і водгукамі падарожнікаў. Усе аб'екты будуць мець сістэму пазначэнняў даступнасці для дзяцей, людзей з інваліднасцю і з хатнімі гадаванцамі. Гэта наша адна з галоўных місій — зрабіць так, каб праграма была карыснай для ўсіх катэгорый людзей.

Для праверкі ідэі на запатрабаванасць Святлана выступіла на Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ і Міжнародным студэнцкім экалагічным кангрэсе, дзе праект быў адзначаны як перспектыўны. Пасля сабрала каманду спачатку сярод сваіх знаёмых, праз некаторы час знайшла некаторых спецыялістаў праз конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend.

— Самае складанае ў распрацоўцы такой праграмы — згуртаваны калектыў. Трэба разумець, што наш праект у першую чаргу сацыяльны і мы не плануем зарабляць на ім вялікія грошы. Зараз у нас тры спецыялісты, уключаючы мяне. Гэта вэб-распрацоўшчык Міхаіл Чваркоў, бізнес-аналітык Андрэс Рыа, я ж адказваю за прасоўванне мабільнай праграмы. На сёння мы працуем над праграмай для карыстальнікаў android, пазней яна будзе даступная і для ios. Каб мабільная праграма атрымалася карыснай і запатрабаванай, у яе трэба ўкласці шмат сіл і, што немалаважна, грошай. Пакуль фінансаванне не шукаем, але ўжо ёсць тыя, хто гатовы нас падтрымаць і дапамагчы з пошукам інвестараў, — расказала Святлана.

Праект TheGreenWay не мае крайніх тэрмінаў рэалізацыі і можа пастаянна абнаўляцца па меры развіцця сеткі «зялёных маршрутаў» у краіне. Аднак Святлана кажа: «Зацікаўленых у нашым прадукце шмат, асабліва ў сувязі з каранавірусам многія хочуць арганізаваць падарожжа па Беларусі, таму спадзяёмся, што атрымаецца закончыць работу ў найбліжэйшы час».




**Даведка**

Арганізатарам конкурсу выступіў эканамічны факультэт БДУ пры падтрымцы EPAM Belarus. Першы яго сезон прайшоў летась у маі і сабраў больш за 40 праектаў. Сёлета конкурс атрымаў статус міжнароднага і аб'яднаў удзельнікаў з Беларусі, Казахстана і ЗША.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ІХ НАЗВАЛІ АТЛАНТАМІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Гэта новы для ўсіх нас вопыт, сюды ў асноўным набіралі тых, хто яшчэ ніколі не быў у студатрадзе, таму прыемнае хваляванне перад першымі працоўнымі буднямі было. Аднак ужо зараз магу сказаць, што студэнтам працаваць тут спадабалася. Хлопцы і дзяўчаты заступаюць у дзве змены па восем гадзін штодня, за кожным з іх замацаваны вопытны майстар. Жывём у інтэрнаце, дзе вельмі ўтульна і добра кормяць, адпачынак праводзім актыўна. Да закрыцця працоўнага семестра, якое адбудзецца 21 жніўня, запланаваны спаборніцтвы па футболе, валейболе, стрытболе, тэнісе, шахматах, цікавыя конкурсы накшталт «Візітоўка атрада», на найлепшую студатрадаўскую песню, таксама інтэлектуальныя гульні, творчы фестываль «АтлантФЭСТ». І гэта далёка не ўвесь спіс, — расказвае Крысціна.

Дзяўчына дзеліцца, што ў наступным годзе ёй хацелася б і надалей удзельнічаць у падобных праектах: «Калі ўпершыню замест тыповага адпачынку летам я абрала работу ў студатрадзе, з боку матулі сустрэла неразуменне. Аднак праз некаторы час яна ўбачыла, наколькі гэта для мяне важна і цікава. Я стала больш адкрытай і камунікабельнай, лічу, што гэты вопыт бязмоўна дае добры старт для ўсебаковага развіцця кожнага студэнта».



Камандзір праекта «Атлант-2020» Крысціна ХУБУЛАВА і камісар Кірыл РАМАНАЎ.

Дваццацігадовы **Уладзіслаў САВЕЛЬЕЎ,** чацвёртакурснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, на «Атланце» займае пасаду камандзіра ў «Эйфарыі» — атрадзе сваёй ВНУ.

— Дагэтуль два гады запар летам ездзіў на Усебеларускую маладзёжную будоўлю. Аднак сёлетні праект адрозніваецца ад усіх папярэдніх, таму цікава, што ён нам прынясе. Адбор байцоў на праект «Атлант-2020» пачаўся з верасня мінулага года. Студэнты на працягу некалькіх месяцаў паказвалі свае здольнасці і ўменні, удзельнічалі ў розных мерапрыемствах, і ўвесну мы канчаткова вызначыліся з камандай, — усяго ў нас у атрадзе 11 хлопцаў і дзве дзяўчыны. Наш атрад стартаваў на аб'екце першага ліпеня. Спачатку многім было нялёгка з-за таго, што доўга трэба стаяць на нагах, аднак хутка прызвычаіліся. Мае абавязкі як камандзіра заключаюцца ў тым, каб вырашаць пытанні, якія ўзнікаюць у каманды, узаемадзейнічаць з камісарам, а таксама выконваць работу на самім прадпрыемстве. Напрыклад, калі кагосьці паставілі на складаны працэс і чалавек не спраўляецца, я звяртаюся да майстра і ён дае студэнту іншае, лягчэйшае заданне. У асноўным хлопцы стаяць на канвееры, збіраюць халадзільнікі, а дзяўчаты сочаць за тым, каб усё было зроблена якасна, а затым абклейваюць тэхніку брэндзіраванымі наклейкамі.



Уладзіслаў лічыць, што праца ў студатрадзе на такім маштабным праекце — гэта не толькі добрая магчымасць падзарабіць студэнту, а таксама стымул годна прадстаўляць свой універсітэт сярод іншых. «Мая галоўная мэта на гэты час — набрацца вопыту і, калі атрымаецца, у далейшым стаць адным з удзельнікаў галоўнага каманднага складу БРСМ. Гэта вельмі крута!»

Васямнаццацігадовая **Ангеліна ТУРОК,** студэнтка трэцяга курса Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, разам з Уладзіславам працуе на «Атланце» ў адным атрадзе. Аб праекце дзяўчына даведалася ад сваёй сяброўкі. «Паехалі туды разам?», — прапанавала яна Ангеліне, і вось яны ў складзе каманды «Эйфарыя».

— Зразумела, быў страх, рап там штосьці не атрымаецца, будзе фізічна цяжка, не ведала, чаго чакаць ад нашай задумы, — усё ж такі дзяўчат тут няшмат. Аднак хутка зразумела, што хвалявацца не варта, спецыялісты ўсяму навучаць. Бацькі таксама падтрымалі. У першы рабочы дзень было даволі цяжка, але надалей ужо стала прасцей, і перажыванні амаль сышлі. Мы працуем на аб'екце і ў першую, і ў другую змену. Праз кожныя дзве гадзіны — перапынкі, у тым ліку і на абед. Таксама калі на працягу дня ёсць вольны час, абмяркоўваем і рыхтуемся да наступных мерапрыемстваў. Пасля насычанага дня вяртаемся ў інтэрнат, і добра тое, што ў маім блоку жывуць дзяўчаты з іншых атрадаў, можна падзяліцца з імі сваімі ўражаннямі і паслухаць іх.



Ангеліна ўпэўнена, што працоўны семестр на «Атланце» пройдзе лёгка і цікава: «Хачу тут знайсці сяброў і атрымаць карысны вопыт для будучыні, добра правесці час з іншымі студэнтамі. А яшчэ важнай матывацыяй для мяне з'яўляецца магчымасць зарабіць уласныя грошы для далейшага навучання ў аўташколе. Думаю, студатрад дае маладым людзям уяўленне пра фізічную працу і разуменне таго, што грошы не прыходзяць лёгка. Папрацаваўшы на заводзе, ужо зусім па-іншаму стаўлюся да іх. Спадзяюся, у наступным годзе мне пашчасціць ізноў прыехаць сюды».



Для дваццацігадовага студэнта Беларуска-Расійскага ўніверсітэта **Яўгена ЕРАШОВА** працоўнае лета ў рамках студатрада сёлета адбылося ўпершыню і адразу ўдала, — каманда «BRUklin» выбрала хлопца сваім камісарам.

— Наш калектыў складаецца з 28 хлопцаў і адной дзяўчыны, — самых актыўных, ініцыятыўных маладых людзей нашай ВНУ. У нас усе роўныя па значнасці, гэта безумоўна крута: калі ўзнікае пэўнае пытанне або праблема, вырашаем іх разам. Спачатку на прадпрыемстве з намі праводзілася навучанне, інструктажы. Першы працоўны тыдзень прайшоў для ўсіх нас добра, мы настроеныя на плённую працу. Тут неабавязкова быць вельмі моцным у фізічным плане — зыходзячы з фізічных даных, для кожнага студэнта майстар знойдзе работу. Радуе, што кожны дзень распісаны, напоўнены падзеямі, рознымі мерапрыемствамі, як спартыўнымі, так і забаўляльнымі — дакладна не засумуеш.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# З «БАЗАЙ» У ГАЛАВЕ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Юныя гараджане шчыра дзякавалі за тое, чаму навучыліся ў многіх настаўнікаў. І, як у папулярнай праграме «Поле цудаў», карыстаючыся выпадкам, абавязкова прасілі перадаць ім словы ўдзячнасці са старонак газеты. Заўсёды з цеплынёй будуць успамінаць Людмілу Іванаўну Маліноўскую, класнага кіраўніка, настаўніка рускай мовы і літаратуры. Аляксей вельмі дзякаваў Ірыне Іванаўне Грыгор'евай, настаўніцы пачатковых класаў сярэдняй школы № 5, дзе хлопец вучыўся раней...

Задаў пытанне пра нядаўнюю хвалюючую падзею ў іх жыцці: што запомнілася на цырымоніі выпускнога? Аляксей сказаў, што не толькі яго, а ўсіх уразіла, як Яраслаў падарыў настаўніцы кветкі, стаўшы на калена. Такім чынам падзякаваў ад імя аднакласнікаў адначу з найлепшых выкладчыкаў праграмавання не толькі ў Беларусі — Веранікі Лакціной. Яе выхаванцы традыцыйна ў спісе найлепшых падчас міжнародных спаборніцтваў.

Дарэчы, вучні называюць яе і Вікторыяй, і яна гэтым вельмі задаволена. Напэўна, таму што шмат разоў заваёўвалі з ёй тую самую вікторыю падчас вельмі складаных выпрабаванняў. Цікава, што былыя яе выхаванцы фінансава дапамагаюць цяперашнім, калі неабходна аплаціць паездку за мяжу, напрыклад. У прыватнасці, вядомы праграміст Дзмітрый Лук'яненка пералічыў грошы на білеты на самалёт у Казахстан для Аляксея Ульянава. А той жа мог і не паехаць з-за дарагавізны квіткоў у Алматы, дзе традыцыйна праходзіць Міжнародная Жаўтыкаўская алімпіяда па матэматыцы, фізіцы і праграмаванні. Сёлета яна адбылася шаснаццаты раз. На ёй Аляксей Ульянаў стаў бронзавым прызёрам. А залаты медаль — у Ярослава Барысава. Да таго ж хлопец стаў яшчэ і абсалютным чэмпіёнам сярод пераможцаў. Да гэтага быў там бронзавым прызёрам.

А ўсе віцебскія ўдзельнікі разам прывезлі дамоў з Казахстана сем медалёў. І тры з іх ліку — у скарбонцы гімназіі № 8. Усяго ў гэтым прэстыжным «форуме разумнікаў» брала ўдзел каля 85 каманд з 20 краін. У 26 беларусаў у выніку было па шэсць залатых і сярэбраных плюс 11 бронзавых узнагарод.

Да гэтага Аляксей і Яраслаў разам удзельнічалі і ў адкрытай XX Усерасійскай каманднай алімпіядзе школьнікаў па праграмаванні, якая ў лістападзе прайшла ў Санкт-Пецярбургу. У ёй спаборнічала каля 250 каманд з дзясятка краін. Мае суразмоўнікі былі ў складзе той, якая атрымала дыплом другой ступені.

У скарбонцы перамог Ярослава і «серабро» ў бакінскай Міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы сярод школьнікаў, якую правялі летась у жніўні. Яшчэ юнак — абсалютны пераможца заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы, і ў яго дыплом другой ступені за поспех у сталіцы Расіі падчас алімпіяды па праграмаванні. Сёлета павінен быў ехаць у Сінгапур, але з-за пандэміі «турнір» пройдзе ў сусветным павуцінні.

Аляксей сур'ёзна займаецца інфарматыкай некалькі гадоў. Дадаў, што гэта заслуга Веранікі Лакціной, дзякуючы якой ён нават перайшоў вучыцца з іншай школы. А да гэтага займаўся ў яе гуртку.

Яраслаў жа прызнаўся, што ў пятым класе наогул не любіў тое, дзякуючы чаму яго цяпер ведаюць як вельмі перспектыўнага айцішніка. Нават прагульваў факультатыўныя заняткі...

Сябры разам будуць вучыцца ў ВНУ. Сказалі, што вырашылі стаць студэнтамі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, бо там цяпер ёсць магчымасць павучыцца і ў выкладчыкаў з «Яндэкса». Чулі, што ёсць шанц прайсці добрую практыку ў гэтай транснацыянальнай кампаніі.

***Аляксандр ПУКШАНСКІ.***

Ледзяны сабака Гона, з гарбатым шыпастым хрыбтом з натапыранымі льдзінкамі рэдкай поўсці, плоскаю галавой ды трыма доўгімі хвастамі, што праразалі ў заснежанай зямлі глыбокія баразны, падбіраўся ўсё бліжэй, прыпадаючы брухам да зямлі. Правалы вачніц у аголеным сабачым чэрапе свяціліся зеленаватым агнём, а вострыя іклы скаліліся больш чым непрыязна. Ад усёй вусцішнай постаці так і павявала дыханнем сцюжы — і таксама халоднаю ярасцю.

— Заўсёды... болей любіў катоў, — прашаптаў Ясь. Донай пакруціў галавой: наўрад ці пачварны кот, складзены з зачараванага лёду, кагосьці тут парадаваў бы. Сабака ж уцягнуў паветра скрозь зубы і вантробна загыркаў, утаропіўшыся ў Доная і Яся. Злосна шчоўкнуў пашчай, зглядзеўшы Ручай, які поўніўся пагрозлівым спевам рун, і зірнуў далей па дарозе, на замкнёныя вароты вёскі, відаць, прымерваючыся, прынюхваючыся.

А там, за ненадзейнаю агароджаю — Донай і сам адчуваў гэта ўнутраным звярыным чуццём — хавалася таропкае біццё многіх жыццяў, кволых і не абароненых ахоўнымі чарамі. Ды яшчэ клубілася там тое, што прыцягвае любога драпежніка, — жах.

Цікава, трохі адчужана гаварыў сабе Донай, назіраючы за зверам па-над клінком, як доўга вытрымаюць вароты? Колькі там было выстаўлена дружыннікаў? Двое, трое? У любым выпадку, замала.

А яшчэ там Сташка.

Донай рыпнуў зубамі і пераступіў з нагі на нагу, адцясняючы Яся плячом трохі назад і ўбок. На ягоны ледзь заўважны рух ледзяны сабака паспешліва крутануўся і гыркнуў мацней — быццам побач заварочаўся гром. Доўгія хвасты, складзеныя з шыпастых ледзяных пазванкоў, з сілаю забілі па дарозе, высока падкідваючы камякі бруду ды каліўцы сухой травы.

Цяжкі, думаў Донай, з сумневам звузіўшы вочы. Вядома, такая махіна. Вось ведаць бы, плаваць ён умее? І наколькі ўвогуле плывучы зачараваны лёд?

— Пастараюся адвесці яго ад вёскі, — прагаварыў Донай ціха. — Сам. Праз бор. Да возера, можа. Там... палонкі.

Ясь, выдыхнуўшы, згодна паківаў і прашаптаў, каб Донай не хваляваўся — ён, музыка, хутка прывядзе някепскую падмогу.

— Сцеражыся!.. — крыкнуў Ясь з цемры. Ахнула і засіпла лютня. Донай пакаціўся па снезе, усляпую ўдарыў кордам. Пасыпалася ледзяная крошка, ганчаковы сківіцы ляснулі ў Доная над вухам. Ён ударыў ізноў, перакуліўся цераз плячо — і ўбачыў снег над сабою і цень, які падаў на гэты снег зверху, цень, ад якога павявала сцюжаю. Сцiснуўшы зубы, Донай узляцеў імкліваю віхураю, рынуўся наперад, да хваёвых узгоркаў, рассякаючы сабою суметы, праломліваючыся скрозь сухія калючыя зараснікі. Гона памкнуўся следам, і яго халодны подых Донай увесь час адчуваў на сваёй шыі.

Уздымаючы іскрыстую снежную замець, ён пранёсся па схіле між хвояў. Ганчак, хакаючы і шчоўкаючы пашчай, з аглушальным тупатам ляцеў следам, задзяваючы хвастамі ствалы дрэваў, так што порстка ўзляталі ўверх драбочкі кары ды сухая ігліца. Мільгалі дрэвы, мільгалі пагоркі, зарослыя асіннікам сухія лагчыны, равы і бураломы, а возера ўсё не было відаць. Хутка Донай з адчаем зразумеў, што пачынае стамляцца, што міжволі слабее, запавольваецца. А вось ганчак бег нястомна, не разбіраючы дарогі, і званчэй шчоўкаў страшнаю пашчаю, і падвываў на ляту.

У чарговай лагчыне з-пад снегу выбіралася нешырокая ручаіна, схопленая сінявалым ільдом. Донай віхураю рвануўся праз яе, ажно ўздыбілася ад ягонага руху ледзяная корка на вадзе, — і, быццам перасекшы нябачную мяжу, раптоўна страціў усю палётнасць ветру ды бяссільна паваліўся на звярыныя сцежкі да вадапою. Стаяў на карачках, патрэсваючы галавою, і дзівіўся: куды магла падзецца ўжо звыклая песня таемных знакаў, якая гучала ўвесь час у самой крыві, якая — вяла, без якой унутры было цёмна і пуста? І Ручай у Донаевай руцэ таксама знямеў, не свяціўся болей ярасным белым агнём, і руны на ім згаслі.

Ганчак праходжваўся ўздоўж вады, злосна ўзрыкваючы, выдыхаючы з правалаў ноздраў серабрыстыя клубы інею. Перасячы тую нябачную мяжу ўслед за Донаем сабака Гона не рашаўся, толькі скаліўся, рыў магутнаю лапай снег, ярасна біў хвастамі па засыпаных сухою іглічай валунах ды карчагах. Донай, абапершыся на корд, падняўся на ногі. Зірнуў па-над хвоямі, якія рассыпаліся па навакольных узгорках, на нізкае пахмурнае неба, што патроху пачынала згасаць. І сэрца Доная абрынулася ў гулкую пустку: аніяк не атрымлівалася згадаць, у якім баку ляжала вёска, а дзе мусіла быць возера. Зноў зазвінелі ў галаве сярэбраныя званочкі, ад якіх падкотвала млосць, і Доная прабрала нядобрая дрыготка.

Ён правёў рукою па валасах, часта выдыхаючы мутныя аблачынкі пары. Ледзяны ганчак двоіўся і вырастаў у Донаевых вачах. Снег пад нагамі патроху цямнеў, наліваўся нядобраю чарнатою, як і крысо курткі, як і ўсё вакол. І зараз, без братавага пляча, без спеву рун унутры, без жывога звону корда, гэтая чарната куды болей пужала — бо Донай застаўся з ёю сам-насам.

— Я не хачу, — прашаптаў Донай чарнаце, адчуваючы, як нямеюць ногі. — Я не...

Сабака, улавіўшы ягоную слабасць, з прагным рыкам скочыў наперад. Донай сустрэў яго ўдарам клінка, але ад націску ледзяной грамады адляцеў назад, паваліўся спіною на пругкую сцяну маладога алешніку. А сабака, кульгаючы, са скавытаннем адхіснуўся ўсім целам. На льснянай ледзяной лапе бачны быў чорны след ад корда — быццам зброя ў Донаевых руках была распалена дачырвана.

Ганчак раз'юшана ўзвыў і, размахнуўшыся, секануў хвастамі, быццам бізунамі. Донай ухіліўся, адступіўшы на крок, другі, ад трэцяга хваста паспеў засланіцца клінком.

Сабака шчоўкнуў зубамі, заскавытаў, бо некалькі пазванкоў таго хваста, што напароўся на клінок, адляцелі прэч. А пасля, разявіўшы пашчу, кінуўся, і сілы, каб ухінуць, каб ухіліцца, у Доная не засталося.

Разам з зубастай ледзяною махінаю ён кулём пакаціўся долу, ломячы алешнік. Падаючы, сек ды сек усляпую кордам, адбіваючыся ад прагных іклаў, што падбіраліся да горла, што жадалі рваць і нявечыць.

Гэта было трохі зацягнутае, павольнае падзенне, зусім як у сне, і, зусім як у сне, вакол узнялася душнай хваляю літасцівая цемра. Ганчака гэтаю хваляй падхапіла і знесла ўбок, і там пачвара са страшэнным грукатам забілася і завыла, патроху заціхаючы. А Донай упаў на самае дно цемры і застаўся нерухома ляжаць на стылай утрамбаванай зямлі, усё яшчэ сціскаючы дзяржальна свайго корда.

Сярэбраныя званочкі ў галаве паступова сціхлі. Замест іх мякка загаварыў Вельс, што ляжаў тут жа, побач, зусім як тады, у маленстве, калі яны мусілі дзяліць адзін ложак. — Памятаеш, даверліва шаптаў брат, моцна трымаючыся за Донаеў рукаў, памятаеш, мы тады былі зусім малыя, і была ў цябе чорная котка? Ласкавая такая, дробненькая і круглая, з доўгім распушаным хвастом, з шаўковай поўсцю, з ціхімі далікатнымі лапкамі, з разумнымі зялёнымі вачыма. І аднойчы котка збегла ў лес, а мы пайшлі за ёю. Памятаеш?..



**Не адзін месяц «Маладосць» друкуе гэты захапляльны твор, дорачы шматлікім аматарам фэнтэзі хвіліны і гадзіны задавальнення ад ледзь не літаральнага сузірання сюжэтных падзей. Прачытайце ўрывак — і адкажыце: хіба вы не апынуліся там, па той бок старонкі?..**

## Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ

**Раман-фэнтэзі**
*Урывак*

# Век людзей

---

## Сяргей ШАМАТУЛЬСКІ

# ЗАБІТЫЯ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ



**«Твае, мае, яго, нашы і, несумненна, чужыя: дзевяностыя — згубная настальгія», — так пачынае свае разважанні пра страчаны час аўтар калонкі з назвай, якая менавіта да гэтых разваг больш за ўсё і пасуе, — «Артэфакты памяці».**

Рай заканчваўся за футбольным полем. Там, на доўгім пероне, кінутым шэрай стужкай паміж пуцямі, была яго мяжа. Чыгуначны канец усяго. Рыса. Маўклівая бездань са з'едлівымі гудкамі прыгарадных і хуткіх — «Заляціць мяч — не шукай» — ды вусцішнымі вочкамі-лямпачкамі, сінімі і бяздушнымі. Мы туды не хадзілі. Пазбягалі перасякаць гэтую каменную мяжу, за якой і чорная рука, і марскі крыважэрны спрут, і зніклы суседскі хлопчык з папяровым, аблезлым ад летняга сонца тварыкам — памятым, няшчасным, — і іншае страшнае, усё. Усё там.

А тут — рай. Ці зусім не тут, а ў нейкім іншым, цудоўным свеце, які мы, пасталеўшы, адважыліся пакінуць назаўжды?

Але свіст. Цягнік зрушыўся. Хіба было ўсё гэта на самай справе, ці перон і мяч — не што іншае, як ілюзія ды гульня пад назвай «Шчаслівае дзяцінства — інстытут — тое самае лета», створаная мозгам у якасці абароны перад невядомасцю? Цяпер ужо не дазнацца. У плацкарце нам выдалі не бялізну і не гарбату, а самую небяспечную рэч, якая ўваходзіць у кошт квітка.

Прасцей кажучы, нам выдалі настальгію.

Такі кампактны сусвет утульнай журбы, да краёў набіты суб'ектыўнай памяццю. Цэлафанавы пакет, з якога мы, грэбуючы інструкцыяй, бралі занадта шмат — і ў выніку страцілі час. Падобна нянькам, што забівалі чужых дзяцей з надзеяй вярнуцца на радзіму, мы, заблытаўшыся ў бясконцай рэфлексіі, прымудрыліся забіваць цэлыя дзесяцігоддзі.

Пахабныя малінавыя пінжакі, бландзінкі, інфляцыя і мерседэсы, «твае-мае» і кінематаграфічна крыштальныя дзевяностыя — ужо не эпоха. Дзевяностыя — чорная дзірка, якая паглынула нулявыя і дзясятыя. Што адбываецца з намі сёння, адбываецца адначасова і ўчора, а дваццаты год — не больш чым лічба. На хуткасцях, калі пакаленні змяняюцца амаль імгненна, мы з цяжкасцю можам згадаць двухтысячныя, затое лёгка пераказваем гісторыі «апошніх гадоў ХХ стагоддзя».

Свет стаў іншы пасля падзення вежаў-блізнят? Здаецца, тут пра гэта нават не чулі. Масавая культура працягвае карыстацца састарэлымі кодамі. І калі вы скажаце, што дзевяностыя — усяго толькі мода, то я скажу, што гэта ўжо традыцыя. Так і не ўсвядоміўшы атрыманы вопыт, мы, як заўзятыя іпахондрыкі, зрабілі з яго нацыянальную траўму — хранічную «хваробу», якую ўжо немагчыма аналізаваць. Таму што фальклор, вядома, не падлягае рэфлексіі.

Сталае жаданне вярнуцца назад, выправіць ці хоць бы растлумачыць тое, што здарылася, толькі ўскладняе міфы і далей адводзіць нас ад праўды. Так, сентыментальная настальгія мірыць мінулае і сучаснасць, але яна ў сваёй татальнасці яшчэ і пазбаўляе нас будучыні.

Футбольнае поле зарасло, перон абваліўся, а мячык так і не быў знойдзены. Чорная рука не трапіла ў твой горад, ды і канца, як аказалася, не існуе. Цягнік едзе наперад і, гледзячы праз каламутнае акно вагона, раптам усведамляеш: рай знаходзіцца зусім не там — ён заўсёды быў тут, проста мы гэтага не заўважалі.

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 23 июля 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества) | административно-бытовой корпус АБЗ «Гореничи» общей площадью 204 кв. м, инв. № 611/С-916; складское помещение для хранения дров общей площадью 39 кв. м, инв. № 611/С-34214; техническое помещение для обслуживания водонапорной башни общей площадью 10,2 кв. м, инв. № 611/С-34215; стол «Амадей» т102 (1 шт.); силовой тренажер HouseFit DH – 8157 (1 шт.); бильярд «Магнат – Плюс» 8 фут. (1 шт.); машина стиральная Gorenje WS43101 (1 шт.); водонагреватель Ariston SG HP 200V (1 шт.); киевница напольная ПАЖ-2 (материал ясень) (1 шт.); светильник «Венеция» (1 шт.); стул «Амадей» s102 (6 шт.); стул ИСО Black (15 шт.); тумба для ТВ «Ниагара» (2 шт.); чехол защитный для бильярдного стола 8ф (1 шт.); шары «Арамит Премьер» (1 шт.); шкаф с витриной «Дэнвер-Э-9М» (1 шт.); электросушилка для рук Puff-8820 (3 шт.); антенна Variant 60 (2 шт.); бра Орхидея 13200/2 (4 шт.); зеркало (1 шт.); жалюзи вертикальные Лайн 1,5*2,2 кв. м (1 шт.); жалюзи вертикальные Лайн 1,7*1,7 кв. м (4 шт.); кий «Гигант-М», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); кий «Онтарио» 1РС целый, 149 см (материал: канадский клен) (4 шт.); кий «Ярость», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); мягкий уголок «Лагуна комфорт» (1 шт.); емкость подземная, горизонтальная, металлическая 50 м³ (1 шт.); телевизор «Горизонт» 21KF19V (1 шт.); цифровой спутниковый ресивер Eurosat DVB-3023 (1 шт.) |
| Местонахождение | Минская обл., Березинский р-н, Капланецкий с/с, 2, 2/1, 2/2 |
| Сведения о земельном участке | площадь: 2,3610 га, кадастровый номер: 620482302101000151 |
| Продавец имущества | ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| Организатор торгов | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| Начальная цена предмета торгов без учета НДС | 108 863,66 бел. руб. |
| Сумма задатка | 10 800,00 бел. руб. |
| Условие торгов | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **23 июля 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляется **с 10.07.2020 по 21.07.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-58, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)**

## ОАО «Пинский винодельческий завод»

**сообщает о проведении 28.07.2020 г. вторые электронные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества**

1. **Здание магазина № 2,** г. Брест, ул. Шоссейная, 9 – 284 200,00 бел. руб.
2. **Магазин № 35,** Витебская обл., Оршанский р-н, аг. Межево, ул. Центральная, 62 – 210 000,00 бел. руб.
3. **Административное здание,** Витебская обл., г. Миоры, ул. Комсомольская, 63 – 48 160,00 бел. руб.
4. **Торговое помещение магазина «Торговый центр»,** Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Ленина, 50а, пом. 1 – 83 300,00 бел. руб.
5. **Здание,** Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Подольская, 18А – 152 600,00 бел. руб.

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by.**

УНП 200110728

## БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Капитальное строение с инвентарным номером 700/D-145704, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 61А-67, общей площадью 75 кв. м, год постройки – 1969** |
| **Начальная цена продажи** | 70 000,00 (семьдесят тысяч белорусских рублей, 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 11 666,67 (одиннадцать тысяч шестьсот шестьдесят шесть белорусских рублей 67 копеек) |
| **Сумма задатка** | 3 500,00 (три тысячи пятьсот белорусских рублей 00 копеек) – 5 % |
| **Открытый аукцион состоится** | **12.08.2020 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал** |
| **Заявления и документы на участие принимаются** | в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 11.08.2020 включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефону: (8 0222) 403122, моб. (8 029) 169 39 68 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 3500,00 белорусского рубля на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;
- гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Заключительная регистрация участников аукциона – 12 августа 2020 г. с 10.30 до 10.55.** Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Помимо этого на победителя аукциона ложатся затраты по регистрации договора покупки-продажи в РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 25 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

**Центр Промышленной Оценки**
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | **РУП «Строительно-монтажный трест № 22»,** Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. без НДС | Шаг аукциона, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 41058 | **кран мостовой 16-5К-22,5, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-5, в 0,3 км к востоку от д. Ксты** | 7 370,00 | 368,50 |
| 2 | 03012 | **линия электропередачи, по адресу: Витебская область, г. Полоцк, микрорайон Аэропорт** | 1 899,58 | 94,98 |

**Ссылка на предыдущее извещение: опубликовано в газете «Звязда» 03.06.2020 г.**

**Порядок ознакомления с предметом аукциона: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, тел. +375 (29) 516 32 23**

Лица, желающие принять участие в торгах обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

